WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

18 ВЕРАСНЯ 2009 г.
ПЯТНІЦА
№ 176
(26534)

Кошт 600 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

Беларусь і Індыя пацвердзілі ўзаемную зацікаўленасць у актывізацыі супрацоўніцтва

Аб развіцці беларуска-індыйскіх сувязяў ішла размова на сустрэчы Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі з міністрам замежных спраў Індыі Саманахалі Малаяхам Крышнам.

«Я вельмі часта гавару, што мы ганарымся сваёй дружбай з такімі вялікімі дзяржавамі, як Расія, Кітай, Індыя, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — За гады нашага супрацоўніцтва мы дасягнулі нядрэнных вынікаў. У мінулым годзе наш тавараабарот з Індыяй наблізіўся да паказчыка ў паўмільярда долараў». Разам з тым, лічыць Прэзідэнт, гэтага недастаткова пры існуючым патэнцыяле.

Кіраўнік беларускай дзяржавы звярнуў увагу, што ў бліжэйшы час Беларусь і Індыя павінны накіраваць сумесныя намаганні на пашырэнне гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва. «Мы чакаем актывізацыі індыйскіх інвестараў на беларускім напрамку, — сказаў Аляксандр Лукашэнка, — і хацелі б вызначыцца па двух-трох важных праектах, засяродзіць увагу на іх і паспрабаваць ажыццявіць нейкі прарыў у гэтым плане ў інвестыцыйнай сферы, сумеснай дзейнасці ў вытворчай галіне, а потым падцягнуць да гэтых прарыўных напрамкаў іншыя сферы».

Прэзідэнт асабліва адзначыў высокі ўзровень развіцця беларуска-індыйскіх сувязяў у навукова-тэхнічнай сферы. «Нашы вучоныя супрацоўнічаюць па ўсіх напрамках і ва ўсіх галінах. Гэта сведчыць аб тым, што ў нашым узаемадзеянні няма закрытых тэмаў», — адзначыў ён. Пазіцыі Беларусі і Індыі практычна супадаюць па ўсіх пытаннях міжнароднага парадку дня. «Беларусь і Індыя — актыўныя члены Руху недалучэння. Мы маглі б адыграць значна большую ролю ў актывізацыі супрацоўніцтва ў рамках гэтай арганізацыі», — упэўнены Аляксандр Лукашэнка.

Саманахалі Малаях Крышна ў сваю чаргу адзначыў важнасць праведзенага ў 2007 годзе візіту ў Індыю кіраўніка беларускай дзяржавы, па выніках якога рэалізуюцца важныя дамоўленасці па многіх напрамках двухбаковага супрацоўніцтва. Кіраўнік МЗС Індыі пацвердзіў імкненне індыйскага боку да актыўнага нарошчвання тавараабароту з Беларуссю.

Паводле паведамленняў прэс-службы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і БЕЛТА.

Іван БАМБІЗА, намеснік прэм'ер-міністра:

«МЫ ДАСЯГНУЛІ ТАКОГА ЎЗРОЎНЮ, ШТО МОЖАМ ПРАГРАМАВАЦЬ УРАДЖАЙ»

Сёння ў Кобрыне пачынаецца Рэспубліканскі фестываль-кірмаш працаўнікоў вёскі «Дажынкі-2009». Да гэтага свята работнікі аграпрамысловага комплексу падышлі з неблагімі вынікамі

Нягледзячы на капрызы надвор'я, сёлетні каравай атрымаўся даволі важкім — як паведаміў намеснік прэм'ер-міністра Іван Бамбіза, валавы намалот склаў 9 мільёнаў тон. Сярэдняя ўраджайнасць — 37,3 цэнтнера з гектара. Паводле ацэнак спецыялістаў, на палетках быў сфарміраваны значна больш высокі ўраджай, але паўплывалі неспрыяльныя ўмовы надвор'я. Затое рапсу атрымана больш, чым летась, — 750 тысяч тон (мінулагодні паказчык на 200 тыс. тон меншы). Гэта даволі выгадная культура, якую актыўна пастаўляюць і на экспарт: на знешнім рынку будзе рэалізавана каля 100 тыс. тон масла насення рапсу.

У амбарнай вазе сёлетні каравай «пацягне» на 8,2—8,3 млн тон. Як заўважыў Іван Бамбіза, галоўная мэта — выйсці на 10-мільённы ўзровень вытворчасці збожжа. Гэта рэальная мяжа, якой можна дасягнуць ужо ў самы бліжэйшы час. Збожжа — сур'ёзны валютны тавар, на яго існуе заўсёдны попыт на знешнім рынку. Таму не выключаюцца пастаўкі адпаведнай прадукцыі на экспарт. Аднак гэта пакуль што толькі ў перспектыве. Ніхто не будзе гандляваць збожжам ва ўрон уласнай харчовай бяспецы. Такая магчымасць прапрацоўваецца, але яна будзе рэалізавана толькі тады, калі поўнасцю ўдасца забяспечыць уласныя патрэбы і мець пэўны стратэгічны харчовы запас.

Павелічэнне валавога збору збожжа — стратэгічная задача. «Мы дасягнулі такога ўзроўню развіцця вытворчасці, што стала магчымым праграмаваць ураджай», — запэўніў Іван Бамбіза. Патэнцыял глебы дазваляе павялічваць аб'ёмы вытворчасці раслінаводчай прадукцыі. Напрыклад, апошнім часам агульны збор цукровых буракоў стабільна дасягае 4 мільёнаў тон. Аднак павелічэнне аб'ёмаў будзе дасягацца не за кошт пашырэння пасяўных плошчаў, а шляхам інтэнсіфікацыі вытворчасці.

Паступова будзе змяняцца вага паставак па імпарце. Штогадовая патрэба нашай дзяржавы ў харчовай пшаніцы дасягае 600 тысяч тон. Раней практычна палова гэтай колькасці завозілася з-за мяжы. Сёлета будзе закупляцца толькі 15 тысяч тон цвёрдых гатункаў пшаніцы з высокім узроўнем клейкавіны. Як заўважыў Іван Бамбіза, гаспадаркі блізкія да поўнага забеспячэння ўнутраных патрэбаў грэчкай, просам, аўсом, ячменем, харчовым гарохам. За кошт паставак айчынных вытворцаў удалося пэўным чынам зменшыць цэны на садавіну і гародніну. Ураджайнасць бульбы сёлета меншая, чым летась. Аднак праблем з забеспячэннем спажыўцоў «другім хлебам» не павінна ўзнікнуць: заяўкі гандлю будуць выкананы ў належных памерах. «Мы не маем намеру нейкім чынам «раскручваць» цэны на прадукты харчавання», — заўважыў Іван Бамбіза. Вялікая ўвага надаецца таму, каб раслінаводчая прадукцыя адпавядала ўсім патрабаванням па якасці. Сёлета гаспадаркі паставілі 150 тысяч тон піваварнага ячменю. Паводле слоў Івана Бамбізы, з такога ячменю можна варыць выдатнае піва, паколькі ён адбіраўся па ўсіх адпаведных стандартах.

Аграпрамысловаму комплексу аказваецца заўважная дзяржаўная дапамога — у сярэднім такія выдаткі дасягаюць 10 працэнтаў кансалідаванага бюджэту Беларусі. З дапамогай гэтых інвестыцый удалося значна ўзмацніць тэхнічны патэнцыял сельскагаспадарчых арганізацый. Сёлета гаспадаркі атрымалі 1539 збожжаўборачных камбайнаў: 1261 — вытворчасці «Гомсельмаша», 130 — «Лідаагрmaша» і 148 адзінак пастаўлена з Расіі. Уведзена ў эксплуатацыю больш чым 100 сучасных збожжасушыльных комплексаў.

Як паведаміў Іван Бамбіза, за кошт мадэрнізацыі за апошнія некалькі гадоў аб'ёмы сельскагаспадарчай вытворчасці ўзраслі на 44 працэнты. Праводзіцца актыўнае тэхнічнае пераўзбраенне перапрацоўчых прадпрыемстваў. У Беларусі створана магутнае сельскагаспадарчае машынабудаванне. Як заўважыў Іван Бамбіза, з наступнага года аграпрамысловыя прадпрыемствы практычна не будуць закупляць імпартную сельскагаспадарчую тэхніку, паколькі ўсе патрэбы задавальняюць уласныя вытворцы.

У нашай краіне штогод высаджваецца каля 1,2 тысячы гектараў садоў і 100 га ягаднікаў. Як запэўніў віцэ-прэм'ер, удалося забяспечыць спажыўцоў якаснымі і смачнымі беларускімі сокамі. Але важна не толькі нарошчваць аб'ёмы вытворчасці, а і наладзіць рэалізацыю прадукцыі. Летась за мяжу было пастаўлена харчавання амаль на 2 мільярды долараў. І адпаведны паказчык можна павялічыць. У межах праграмы адраджэння вёскі ўдалося шмат чаго зрабіць для стварэння ў глыбінцы належнай сацыяльнай інфраструктуры. І гэта датычыцца не толькі аграгарадкоў, а і іншых населеных пунктаў.

Для таго, каб выйсці на самаакупнасць, рэнтабельнасць у аграпрамысловым комплексе павінна складаць дзесьці 40 працэнтаў. Зараз адпаведны паказчык — 18 працэнтаў, і гэта някепскі вынік, калі ўлічваць тое, што яшчэ колькі гадоў таму сельская гаспадарка літаральна балансавала на мяжы банкруцтва. Пакуль не выкарыстаны ўсе рэзервы павышэння прадукцыйнасці. Як паведаміў Іван Бамбіза, у 28 працэнтаў гаспадарак сёлета на жніве ўраджайнасць збожжавых склала менш чым 30 цэнтнераў з гектара. Такі ж паказчык у 18 раёнаў. Так што тут ёсць над чым працаваць.

Сёння будуць віншаваць тых, хто па выніках рэспубліканскага спаборніцтва заняў другое і трэцяе месцы. А ў суботу з удзелам кіраўніка дзяржавы будуць ушаноўваць пераможцаў. Дыпломы і ўзнагароды на «Дажынках» атрымаюць больш чым 300 чалавек. Таксама сярод падарункаў — аўтамабілі «Волга», камп'ютары, тэлевізары, халадзільнікі. Лепшай вобласці сёлета не вызначылі, паколькі ніводны рэгіён не дасягнуў плануемых паказчыкаў росту аб'ёмаў сельскагаспадарчай вытворчасці. Сярод раёнаў лепшымі прызнаныя Мядзельскі, Дзяржынскі, Пінскі, Віцебскі, Добрушскі, Брагінскі, Бабруйскі, Слонімскі, Смаргонскі.

Засеяна больш за палову азімых палеткаў

Як паведамілі ў Міністэрстве сельскай гаспадаркі і харчавання, засеяна 803 700 гектараў азімых — 57 працэнтаў агульнай плошчы.

У Брэсцкай вобласці апрацавана 106,7 тыс. га адпаведных палеткаў (43,7 %), у Віцебскай — 122,5 тыс. га (63,5 %), Гомельскай — 138,3 тыс. га (60,2 %), Гродзенскай — 124,2 тыс. га (58,3 %), Мінскай — 179,6 тыс. га (53 %), Магілёўскай — 132,4 тыс. га (68,9 %). Бульба выкапана з 15,1 тыс. гектараў (31,2 працэнта ўсіх участкаў). Усяго гаспадаркі атрымалі 266,4 тыс. тон «другога хлеба». Ураджайнасць сёлета значна ніжэйшая, чым летась — 176,8 супраць 214,6 ц/га. Сельгаспрадпрыемствы працягваюць рэалізацыю цукровых буракоў у лік дзяржзаказу. Як адзначылі ў Мінсельгасхарчы, ужо пастаўлена 442,6 тыс. тон.

Мікалай ЛІТВІНАЎ.

ДАЖБОГ ЖЫВЕ Ў БРАДАХ

Сакральных месцаў, авеяных таямніцамі і легендамі, у краіне даволі шмат. Крыніцы, камяні, прошчы, капішчы і курганы, нават жывыя дрэвы. За вёскай Брады Пружанскага раёна ёсць лапік зямлі, абгароджаны невысокім плотам, які здаўна называюць «Крыжык» альбо «Дзве бярозкі». Гэта — мясцовая святыня. Камень, дакладных памераў якога ніхто не ведае, і крыніца пад ім. Пра святасць найперш сведчаць крыжы, абвязаныя стужкамі. Стужкі ж сведчаць пра тое, што месца людзьмі не забытае. Пра тое ж і кветкі каля крыжоў, і пафарбаваны плот, і скошаная трава.

«Ніколі не было такога, каб да «Крыжыка» не прыходзілі. Раз на год абавязкова збіраліся жанчыны, — сказала па тэлефоне жыхарка Брадоў, бібліятэкар і наша даўняя падпісчыца Іна Яраш. — Ад сваёй бабулі Ганны ведаю, што «Крыжык» служыў і ў якасці царквы, бо свайго храма ў Брадах ніколі не было».

У сувязі з развіццём аграгурызму, этнакультурологі спрабуюць «рассакрэціць» таямніцу з'яўлення за Брадамі валуна з крыніцаю. Несумненна, найперш гэта помнік прыроды, які варта ахоўваць. Святасць месца для жыхароў Брадоў і найбліжэйшых Шчэрбаў тлумачыцца пакуль толькі прыгожай легендай пра тое, што тут Божая Маці вяла свайго Сына. Сведчанне гэтаму — два паглыбленні на валуне, нібыта і сапраўды адбіткі ступняў. У дадатак лекавая якасць крынічнай вады, асабліва пасля яе асвячэння. «Калі чалавеку нездаровіцца і цяжка на душы, ён прыходзіць сюды, — кажа Іна Яраш, — Пабудзе сам-насам, дакранецца да бярозак, прыкладзецца да каменя, глыне вадзіцы. І яму робіцца нашмат лягчэй».

Да «Крыжыка» мяне прывяла **Соф'я БАРЫСЮК** *(на фотаздымку)*, якая пасля доўгажыхарства ў Мінску вярнулася ў Брады даглядаць старэйшую сястру. Самой Соф'і налета восьмдзесят будзе. Гэта яна мне паведаміла, што некалькі гадоў таму ў засушлівае лета да каменя прыходзілі жанчыны прасіць дажджу. Як гэта робіцца, Соф'я Рыгораўна не ведае, але гэткі абрад існуе тут спрадвеку, і нібыта «Крыжык» сапраўды дапамог: пайшоў дождж. Але перад гэтым жанчыны моўчкі прайшлі па вёсцы, панабіралі вады са студняў і панеслі яе да крыніцы. Тое ж распаўсюджваецца і ў выглядзе бібліятэкарка і захавальніца легендаў і паданняў Іна Яраш.

Іна шкадуе, што не засталося больш носьбітаў жывой традыцыі «ісці да «Крыжыка», якія несумненна валодалі старажытнымі сакрэтамі распазнання з'яў прыроды, умення звяртацца да яе, прасіць. Адным з такіх зваротаў і было «выкліканне дажджу».

Было б дзіўна, калі б у самыя атэістычныя часы «Крыжык» не зведаў рэпрэсій. Не абмінуў і яго імпэт будаўнікоў камунізму ў рашучай барацьбе з рэлігіяй. Іна Яраш захоўвае ўспаміны сваёй бабулі пра тое, як засыпалі крыніцу, спілоўвалі крыжы і хацелі бульдозерам сцягнуць валун. Але камень з месца не скрануўся, крыніца не перасохла, а крыжы... замест спілаваных з'яўляліся новыя. «Крыжык» ацалеў. А ад перанесеных пакут ён цяпер яшчэ больш шанаваны і прывабны.

Цікава, што кажуць пра камяні беларускія даследчыкі? Напрыклад, бацька класіка нашай літаратуры Максіма Багдановіча Адам Ягоравіч Багдановіч яшчэ ў 1895 годзе напісаў нарыс пра перажыткі старажытнага светаўспрымання ў беларусаў і да гэтых перажыткаў аднёс камяні з абрадамі каля іх. А адзін з найвядомейшых даследчыкаў XIX стагоддзя Адам Кіркор сцвярджаў, што амаль кожны камень вялікіх памераў ці незвычайнай формы фактычна быў культавым, ушаноўваўся насельніцтвам і меў адметныя паданні пра сваё паходжанне. Не выключана, што брадоўскі валун мог увасабляць Бога па імені Дажбог, бо да яго заўсёды неслі кветкі і грошы. Што датычыць абрада «выкліканне дажджу», паводле энцыклапедыі «Беларускі фальклор», ён вядомы амаль усім народам свету, як плювіяльная магія, і быў вельмі пашыраны ва ўсходніх славян. Значыць, жыхары вёскі Брады Пружанскага раёна з іхнімі здольнасцямі «рабіць цуды» яшчэ ў недалёкім мінулым не былі выключэннем, наадварот, заканамернасцю. Цяпер жа, што ні кажы, гэта сапраўдная экзотыка. Але ці надоўга? Калі прырода не перастане здзіўляць сваімі капрызамі, ці не давядзецца размаўляць з ёю моваю нашых продкаў?

Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

Польшчу ПРАкацілі

Пасля таго, як ЗША адмовіліся ад планаў размяшчэння элементаў амерыканскай супрацьракетнай абароны (ПРА) у Чэхіі і Польшчы, прадстаўнік мінабароны Польшчы заявіў тэлекампаніі CNN, што такі крок Вашынгтона з'яўляецца «катастрофай» і здрадай.

Ён пацвердзіў, што ЗША прыпынілі план па размяшчэнні ПРА на польскай тэрыторыі. У чацвер у Варшаве прайшлі перамовы паміж амерыканскай дэлегацыяй і прадстаўнікамі МЗС Польшчы, і падчас гэтай сустрэчы абмяркоўвалася якраз адмова ЗША ад планаў па размяшчэнні элементаў ПРА на польскай тэрыторыі. З польскага боку ў перамовах удзельнічалі міністр замежных спраў Польшчы Радаслаў Сікорскі і кіраўнік канцылярыі прэзідэнта Польшчы Уладзіслаў Стасяк. Амерыканскі бок прадстаўлялі пасол ЗША ў Польшчы Віктар Эш і прадстаўнікі амерыканскай арміі.

Удзельнікі перамоў адмовіліся каментаваць іх вынікі і не зрабілі ніякіх заяў для прэсы. У пасольстве ЗША ў Варшаве заявілі, што канчатковае рашэнне па гэтым пытанні яшчэ не прынята.

У ноч на чацвер прэзідэнт ЗША Барак Абама па тэлефоне апавясціў прэм'ер-міністра Чэхіі Яна Фішэра, што Адміністрацыя ЗША адмаўляецца ад размяшчэння ў Чэхіі амерыканскай радыёлакацыйнай станцыі ПРА. Раней The Wall Street Journal паведаміла, што Белы дом адмовіцца ад планаў па размяшчэнні элементаў ПРА ў Польшчы і Чэхіі. Рашэнне адміністрацыі будзе грунтавацца на тым, што праграма Ірана па стварэнні ракет сярэдняй дальнасці не рухаецца наперад так хутка, як чакалася раней, і гэта зніжае пагрозу для ЗША і Заходняй Еўропы.

Чавес заклікаў рыхтавацца да ваеннага канфлікту з Калумбіяй і ЗША

Прэзідэнт Венесуэлы Уга Чавес заклікаў лідараў краін, якія ўваходзяць у Саюз паўднёваамерыканскіх нацый (UNASUR), быць гатовымі да ўзброенага супрацьстаяння супраць экспансіі ЗША.

Чавес заявіў, што Калумбія, якая дапусціла стварэнне на сваёй тэрыторыі амерыканскіх ваенных баз, «застанецца ў UNASUR у поўнай ізаляцыі», калі не растлумачыць усе дэталі дамовы з амерыканцамі. Чавес даў зразумець, што Венесуэле неўзабаве, магчыма, прыйдзецца ваяваць не толькі супраць ЗША, але і супраць свайго суседа — Калумбіі, паведамляе NEWSru Israel. Цяпер Чавес патрабуе ад калумбійскіх уладаў гарантый таго, што саюз Багаты і Вашынгтона не прывядзе да ўзброенага нападу на Венесуэлу. Пры гэтым ён выказаў упэўненасць у тым, што амерыканцы з тэрыторыі Калумбіі будуць весці шпіёнскую дзейнасць і «рыхтаваць змову» супраць Венесуэлы.

У Сойме Латвіі прагучаў лозунг «Смерць акупантам!»

Дэпутат Сойма Латвіі Юрыс Дабеліс, выступаючы на пасяджэнні парламента, назваў свайго калегу Аляксандра Голубава «акупантам». Пра гэта паведамляе Mixnews.

Сварка адбылася падчас абмеркавання закона аб абароне жывёл. Дабеліс, выйшаўшы на трыбуну, сказаў Голубаву: «Акупант, зачыні рот!». За гэта ён атрымаў ад спікера папярэджанне, аднак не прыслухаўся і абвясціў: «Смерць акупантам!». Пасля гэтага дэпутату было вынесена яшчэ адно папярэджанне. Дабеліс з'яўляецца дэпутатам ад правай партыі «Айчыне і волі / Рух за нацыянальную незалежнасць Латвіі». Голубаў — член партыі «Цэнтр згоды», якая лічыцца прарасійскай.

Піўны Актобэрфэст у Баварыі пачнецца ў верасні

Піўны фэст у Мюнхене — самая наведвальная падзея ў Германіі. Штогод каля 6 мільёнаў чалавек з усяго свету прыязджаюць у сталіцу Баварыі, каб узяць удзел у дэгустацыі піва і традыцыйных страў, а таксама пазнаёміцца з мясцовымі звычаямі і культурай.

Сёлета Актобэрфэст будзе праходзіць з 19 верасня па 4 кастрычніка. Наведванне фэсту бясплатнае для ўсіх ахвотных, квіткі не патрабуюцца. Афіцыйная цырымонія адкрыцця фэсту з удзелам мэра Мюнхена адбудзецца ў 12.00 у суботу, 19 верасня. У шатры Schottenhamel мэр урачыста адкрые першую бочку піва, пасля чаго ўсе ахвотныя змогуць прыступіць да дэгустацыі. Кошт аднаго літра піва сёлета складзе ад 8,3 да 8,6 еўра, што трохі вышэй за кошты мінулага года (ад 7,6 да 8,3 еўра).

У Беларусі існуюць багатыя традыцыі горадабудаўніцтва

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка накіраваў прывітанне ўдзельнікам і гасцям VIII Нацыянальнага фестывалю архітэктуры «Мінск-2009».

«У Беларусі існуюць багатыя традыцыі горадабудаўніцтва, дзякуючы чаму ўзводзяцца ўнікальныя аб'екты культуры, адукацыі, аховы здароўя, спорту, праводзяцца маштабныя работы па захаванні і рэканструкцыі помнікаў дойлідства. Поспехі беларускіх архітэктараў, будаўнікоў, работнікаў навукі высока ацэньваюцца на прэстыжных міжнародных конкурсах», — гаворыцца ў прывітанні.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што Нацыянальны фестываль архітэктуры, у якім прымуць удзел спецыялісты больш як з 40 краін усіх кантынентаў, прызначаны прадэманстраваць вялікі стваральны патэнцыял і стаць своеасаблівым аглядам дасягненняў перспектыўнай галіны, садзейнічаць развіццю плённага супрацоўніцтва ў гэтай сферы.

Прэзідэнт пажадаў удзельнікам пакараць новыя вяршыні і ўнесці свежыя ідэі ў фарміраванне аблічча беларускіх гарадоў і вёсак.

VIII Нацыянальны фестываль архітэктуры «Мінск-2009» пройдзе ў беларускай сталіцы 17—19 верасня.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

МЕЛОДЫЯ ЗАСТЫЛАЙ ПРЫГАЖОСЦІ

Учора ў выставачным павільёне «БелЭкспа» па вуліцы Янкі Купалы, 27 у Мінску ўрачыста распачаўся VIII Нацыянальны фестываль архітэктуры «Мінск-2009». Яго заснавальнік і арганізатар — пры падтрымцы шэрагу айчынных міністэрстваў, гарадскіх органаў улады, уплывовых міжнародных арганізацый — Беларускі Саюз архітэктараў. Нацыянальныя фестывалі архітэктуры ўжо даўно сталі міжнароднай падзеяй: сёлета да ўдзелу ў ім былі запрошаны архітэктары з больш чым 40 краін Еўропы, Азіі і Амерыкі. У павільёне размясцілася экспазіцыя, што складаецца з больш чым 20 выстаў. Гэта і выставы інавацыйных праектаў для Беларусі і Мінска; і выставы праектных інстытутаў і творчых майстэрняў; персанальныя выставы майстроў архітэктуры з нашай і многіх іншых краін; выстава гарадской скульптуры; архітэктурнай фатаграфіі; выстава вырабаў, паслуг і тэхналогій фірмаў, што працуюць на айчынным будаўнічым рынку...

Ужо на ўваходзе ў павільён увагу прыцягваюць два экспанаты — квадрацыкл і рэтра-аўтамабіль. Гэта творы архітэктара, члена Саюза архітэктараў Рэспублікі Беларусь Уладзіміра МАЦЕЛЬСКАГА. Здавалася б, квадрацыкл — што тут такога? Іх зараз можна сустрэць даволі часта. Але справа ў тым, што канкрэтна гэты квадрацыкл быў сканструяваны колькі гадоў таму, калі большасць з нас ведала пра такія «машынкі» хіба з замежных стужак. А да гэтага, яшчэ ў 1980-я гады, аўтарам былі створаны два веламабілі — пярэдне- і заднепрывадны.

Аднак сапраўдны фурор, пільную ўвагу наведвальнікаў — што мы назіралі, дарэчы, яшчэ да афіцыйнага адкрыцця выставы — чакае адзіны пакуль у краіне экзэмпляр рэтра-аўтамабіля. Шырокай публіцы, да слова, ён будзе дэманстравацца ўпершыню ў Беларусі! Ну, калі не лічыць таго непрацяглага часу, калі ён сваім ходам дабіраўся да выставачнага павільёна па сталічным праспекце. Зірніце на здымак, і вы зразумееце рэакцыю мінакоў.

— Год я шукаў архітэктурнае рашэнне. Потым на працягу яшчэ 2,5 года збіраў аўтамабіль у звычайным гаражы. Гэта была тытанічная праца да 24 гадзін у сваё задавальненне, — смяецца Уладзімір Мацельскі. — Затое потым засыналася без аніякіх праблем.

Вузлы і агрэгаты для рэтра-аўтамабіля падбіраліся ад розных машын яшчэ савецкага перыяду, нешта бралася і ад іншамарак. Рухавік, напрыклад, усталяваны ад аўтамабіля ГАЗ-2410 «Волга». У канструкцыі прадугледжаны шэраг «дробязяў», як іх называе сам стваральнік. Напрыклад, вакуумны ўзмацняльнік тармазоў, рэгуляваная па вышыні рулявая калонка, пярэдняя і задняя падвескі з рэгуляванымі двухбаковымі амартызатарамі, канструкцыя якіх дазваляе змяніць клірэнс, мікраліфт для высоўвання радыёпрыёмніка і іншыя. Важыць рэтра-аўтамабіль каля 800 кілаграмаў, у яго высокая ўстойлівасць. На максімальную хуткасць машыну яшчэ не выпрабоўвалі, аднак можна прыгадаць, што «Волга» пры вазе ў дзве тоны магла «набраць» да 140—150 кіламетраў у гадзіну.

Рэтра-аўтамабіль адразу прыцягваў увагу наведвальнікаў выставы.

Дарэчы, такія распрацоўкі, калі аўто не рэстаўруецца, а збіраецца, як кажуць, з нуля, надзвычай распаўсюджаныя за мяжой (сваю ідэю аўтар «падгледзеў» у 2006 годзе ў Новай Зеландыі), апантаныя гэтым людзі ёсць ужо і ў суседняй Расіі.

Старшыня секцыі скульптуры Беларускага Саюза мастакоў Алена ХАРАБЕРУШ па нашай просьбе наладзіла для журналістаў «Звязды» міні-экскурсію па экспазіцыі скульптур.

— Па запрашэнні кіраўніцтва Беларускага Саюза архітэктараў мы ўдзельнічаем у Нацыянальным фестывалі архітэктуры апошнія тры гады — як пацверджанне сінтэзу мастацтваў. Экспануем працы аўтараў усіх пакаленняў, усе віды пластыкі розных майстроў, — сказала Алена Аляксееўна.

Асабіста мне, напрыклад, спадабалася дэкаратыўная праца мінчанина Валянціна БОРЗДАГА «Браняносец». Матэрыял — дрэва і метал. Побач з ёй стаяла і «Завадная птушка». Як сказала далей суразмоўца, такія скульптуры можна выкарыстоўваць у любым інтэр'еры, галоўнае — каб табе падабалася. Як, скажам, дэкаратыўная аголеная натура з паліраванай бронзы. Скульптурамі розных памераў гэтай тэматыкі захапляецца Васіль АНТАНОВІЧ. Шкада, што газетная плошча не дазваляе пазнаёміць чытачоў з працамі іншых майстроў. Зрэшты, гэтыя творы трэба найперш бачыць самому...

Форум

Экспазіцыя скульптур.

За апошнія гады непазнавальна змянілася аблічча не толькі самой сталіцы, але і іншых гарадоў і гарадкоў нашай краіны. Што гаварыць, у вёсках пачалі з'яўляцца аб'екты, пра якія месцічы яшчэ нядаўна не маглі і марыць, а цяпер ім часам зайздросцяць жыхары нават большых населеных пунктаў. І праца гэта не спыняецца, красамоўнае сведчанне чаму можна ўбачыць у выставачным павільёне — макеты, якія пакажуць, наколькі прыгажэйшымі, сучаснымі і зручнымі для жыхароў стануць нашы гарады і вёскі ў найбліжэйшы час.

Арганізатары форуму назвалі фестываль архітэктуры святам не толькі ўласна архітэктараў, але і ўсіх, хто пражывае ў краіне, займаецца будаўніцтвам і рэканструкцыяй. І з гэтымі словамі цяжка не пагадзіцца, калі прыгадаць вядомы выраз, што архітэктура — гэта застылая музыка. Яе «мелодыя», яе «матыў» штодня прысутнічае ў нашым жыцці ва ўсіх сваіх шматгранных праявах. Галоўнае, напэўна, пачуць іх і зразумець...

Сяргей РАСОЛЬКА.
Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Фрагмент з макета будучай забудовы сталічнага праспекта Дзяржынскага.

ISSN 1990 - 763X

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 18.09.2009 г. (для б/н разлікаў)

▼ 1 долар ЗША	2 765,00
▼ 1 еўра	4 075,33
1 латвійскі лат	5 799,08
1 літоўскі літ	1 179,96
1 чэшская крона	162,36
1 польскі злоты	990,88
▲ 1 расійскі рубель	90,99
1 украінская грыўня	326,25

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў

Цэнтрабанк РФ

USD	30,3881
UAH	35,6459
1000 BYR	10,9467
EUR	44,8133

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

Падпішыцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2009 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.

ААТ «Агенцтва Уладзіміра Граўцова» УНП 100024047 Ліцэнзія Мінсувязі № 02140/0172806 выд. 03.05.2004 да 02.05.2009

Беларусь і Літва маюць намер прадаўжаць збліжэнне ў эканамічнай і палітычнай сферах

Беларусь і Літва пацвердзілі ўзаемную зацікаўленасць у далейшым развіцці двухбаковага ўзаемадзеяння ва ўсіх сферах: эканоміцы, палітыцы, культуры, а таксама максімальнай рэалізацыі патэнцыялу дзвюх краін. Па шэрагу напрамкаў супрацоўніцтва на ўзроўні міністэрстваў і ведамстваў падпісаны адпаведныя дакументы.

Такія вынікі праведзеных 16 верасня ў Вільнюсе перагавораў прэзідэнтаў Беларусі і Літвы Аляксандра Лукашэнкі і Далі Грыбаўскайтэ.

Дзелячыся сваімі ўражаннямі ад сустрэчы з Прэзідэнтам Літвы, Аляксандр Лукашэнка сказаў, што задаволены яе вынікамі: «У мяне вельмі добрыя ўражанні ад гэтай сустрэчы. Мне здалося, што, нягледзячы на прэзідэнцкую маладосць, Даля Грыбаўскайтэ абсалютна валодае сітуацыяй. Да таго ж яна эканаміст, прагматычны палітык. Я вельмі хацеў бы, каб у яе ўсё атрымалася, нават нягледзячы на далейшыя ўзаемаадносіны паміж нашымі дзяржавамі, каб у добрага працавітага літоўскага народа было дастойнае жыццё».

Як адзначыў Прэзідэнт, Беларусі спрабуюць навязаць нейкі выбар паміж Еўропай і Расіяй, сцвярджаючы аб несумяшчальнасці гэтых двух вектараў. «Лічу такую пастаноўку пытання няправільнай, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Наша прынцыповая пазіцыя — быць сувязным мостам паміж Усходам і Захадам». І для гэтага перакананы кіраўнік дзяржавы, у Беларусі ёсць усе ўмовы: як геаграфічныя, так і культурныя, эканамічныя і нават палітычныя.

Беларусь — еўрапейская дзяржава, у краіне паступова дабіваюцца і абавязкова даб'юцца таго, каб беларускія эканамічныя і сацыяльныя стандарты адпавядалі ўзроўню лепшых сусветных.

Аляксандр Лукашэнка з задавальненнем канстатаваў, што такая беларуская пазіцыя апошнім часам знаходзіць усё большае разуменне ў Еўропе. «Перамены да лепшага ў адносінах Беларусі і Еўрапейскага саюза відавочныя», — сказаў кіраўнік беларускай дзяржавы, дадаўшы, што ў многім яны сталі магчымыя дзякуючы актыўнай пазіцыі Літвы.

«Хачу, каб еўрапейцы разумелі: нас нельга прымушаць нешта рабіць. Мы ведаем, што можам і што трэба рабіць у інтарэсах нашага народа. Мы павінны свята берагчы беларускі народ, яго інтарэсы і не можам парушыць канстытуцыйны лад і той курс, які праводзім ужо больш як 10 гадоў», — адзначыў Прэзідэнт. Гэты курс прынёс Беларусі пэўныя поспехі: краіна падвоіла ВУП адносна часу распаду Савецкага Саюза, мадэрнізавала эканоміку, і паводле слоў кіраўніка дзяржавы, калі б не крызіс, за тры-пяць гадоў выйшла б на ўзровень еўрапейскіх стандартаў.

Еўрасаюз важны для Беларусі як крыніца найноўшых тэхналогій і інвестыцый. Беларусь зацікаўлена ў рэалізацыі энергетычных, транспартных і экалагічных праектаў, вырашэнні агульных мытных праблем, збліжэнні тэхнічных нормаў і стандартаў з еўрапейскімі, гарманізацыі заканадаўства. У сувязі з гэтым Прэзідэнт Беларусі лічыць вельмі своечасовым з'яўленне ініцыятывы «Усходняе партнёрства», якая прадугледжвае пашырэнне супрацоўніцтва ЕС з еўрапейскімі суседзямі.

У той жа час у беларуска-еўрапейскіх адносінах застаецца мноства практычных задач, якія накапіліся ў перыяд «застою» ў адносінах Беларусі і ЕС і патрабуюць вырашэння.

Уваходжанне Польшчы і краін Балтыі ў шэнгенскую зону істотна абмежавала магчымасці беларусаў кантактаваць з суседзямі. Беларусь застаецца адзінай краінай у Еўропе, для грамадзян якой шэнгенская віза каштуе 60 еўра.

«Пагадзіцеся, гэта самае абсурднае рашэнне. У чым беларусы правініліся перад Еўрасаюзам, што маюць кошт шэнгенскіх візаў у разы большы? Чаму вы так ставіцеся да беларускага народа?» — звярнуўся кіраўнік дзяржавы да еўрапейскай супольнасці. «Калі вы не любіце Лукашэнку, то прымайце меры супраць яго, а не супраць простых грамадзян», — дадаў ён.

Прэзідэнт лічыць, што Беларусь аб'ектыўна прывабная для еўрапейскага бізнэсу з-за геаграфічнага становішча, развітой інфраструктуры, наяўнасці кваліфікаваных працоўных рэсурсаў, палітычнай і сацыяльна-эканамічнай стабільнасці. Беларусь прызнана чацвёртай у свеце сярод самых актыўных рэфарматараў, і ў рэйтынгу краін па ўмовах вядзення бізнэсу займае 58-е месца, узняўшыся за год на 24 пункты.

У час незапланаванай прэс-канферэнцыі, праведзенай непасрэдна ў холе выставачнага цэнтра, было зададзена шмат вострых пытанняў. Аляксандр Лукашэнка вёў адкрыты дыялог з журналістамі, даючы адказы на ўсе пытанні. Закранаючы правядзенне беларуска-расійскага аператыўна-стратэгічнага вучэння «Захад-2009», Аляксандр Лукашэнка заявіў, што гэта не з'яўляецца дэманстрацыяй сілы і пагрозай Еўрапейскаму саюзу. «Мы не збіраемся пагражаць Літве і паказваць сваю сілу. Я гарантую, што ні адзін снарад або куля не заляціць на тэрыторыю Літвы», — сказаў Прэзідэнт Беларусі, адказваючы на апасенні літоўскіх журналістаў наконт «блізкасці» АСВ да граніцы з Літвой. Вучэнне праходзіць даволі далёка ад беларуска-літоўскай граніцы і нічым не пагражае суседняй дзяржаве. Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што такія ваенныя вучэнні праводзяцца ўжо не першы год. У гэтым годзе фінальная частка вучэння «Захад-2009» пройдзе ў Брэсцкай вобласці. Акрамя таго, кіраўнік беларускай дзяржавы пацвердзіў, што чакае ў Беларусі на вучэнні 29 верасня Прэзідэнта Расіі Дзмітрыя Мядзведзева.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў таксама пацяпленне ў палітычных адносінах з Польшчай. «У нас ёсць прагрэс у эканоміцы, але ёсць некаторыя праблемы ў палітыцы з Польшчай, якія мы пачынаем вырашаць. Не такія далёкія добрыя, цёплыя перспектывы ў адносінах паміж нашымі дзяржавамі», — сказаў кіраўнік беларускай дзяржавы. «З кім з кім, а з Літвой і Польшчай мы проста абавязаны мець добрыя адносіны», — дадаў ён. Прэзідэнт лічыць, што двухбаковы дыялог развіваўся б больш актыўна, калі б Польшча дзейнічала самастойна, не аглядваючыся на Брусель. Гаворачы аб дзеючых у Беларусі саюзах палякаў, Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што іх дзейнасць рэгулюецца выключна рамкамі беларускіх законаў і Канстытуцыі. «Галоўнае — калі вы паляк, але жывяце ў Беларусі, вы перш за ўсё грамадзянін гэтай краіны. Гэта нашы людзі, і я абавязаны пра іх клапаціцца, як пра ўсіх грамадзян Беларусі», — сказаў беларускі лідар.

Закранаючы тэму адмены еўрапейскіх санкцый адносна Беларусі, Прэзідэнт падкрэсліў, што краіна, як і раней, будзе ў першую чаргу забяспечваць інтарэсы сваіх грамадзян і дзяржавы, а не прытрымлівацца скарацечнай кан'юнктуры. «Як ЕС будзе ўспрымаць Беларусь — гэта іх пытанне. Мы не дэманізуем Еўрапейскі саюз і асаблівых ілюзій у гэтым напрамку не маем. Але калі Еўрапейскі саюз хоча забяспечыць надзейнасць, бяспеку свайго ўсходняга напрамку, то выкарыстоўвайце Беларусь у інтарэсах бяспекі і дабрабыту сваіх грамадзян. Мы гатовы да гэтага напрамку супрацоўніцтва і не зацікаўлены ў «закрыцці вокнаў» з Еўропай», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Гаворачы ж аб правах чалавека і іх выкананні ў Беларусі, Прэзідэнт запэўніў, што з гэтым у краіне няма ніякіх праблем. «Галоўнае права чалавека — гэта права на жыццё, а таксама на працу, дастойную зарплату, доступ да СМІ, права на правядзенне сходаў і іншыя. Я заўсёды пытаўся ў еўрапейцаў, у якіх сферах з іх пункту гледжання ў нас ёсць праблемы? Пачынаюць пералічваць, і аказваецца, што і ў Еўропе не ўсё так добра, як па некаторых напрамках у Беларусі», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

«Некаторыя краіны Еўрапейскага саюза дадэмакратызаваліся да таго, і мы гэта нядаўна пачулі, што пачалі адкрыта распаўсюджваць наркотыкі (дазволіўшы іх ужыванне) і туды падаліся ўсе, — адзначыў Прэзідэнт. — Як мы, беларусы, павінны былі на гэта адрэагаваць? Жорстка, негатыўна з-за таго, што ў нас наркотыкі — гэта страшнае злачынства. Але мы не сталі крычаць, як вы часам робіце. І мы чакалі, што Еўрапейскі саюз жорстка адрэагуе на гэта. І асабліва журналісты, прэса дэмакратычнай Літвы і іншая пойдуць фронтам супраць гэтага зла. Чаму не пайшлі? Што, супраць Беларусі ісці лягчэй?»

У якасці другога прыкладу беларускі лідар прывёў сітуацыю з развязваннем ЗША вайны ў Іраку пад маркай пошуку там ядзернай зброі. «Я першым заявіў аб непрымальнасці гэтага кроку, што гэта паход за нафтай, што гэта бандытызм. Вы мяне тады папракалі, крытыкавалі, вы следам пайшлі за Бушам. Чаму? Хусейн, маўляў, вораг, там ядзерная зброя, трэба яго злавіць, павесіць. Павесілі з вашай дапамогай. Дзе ядзерная зброя? Навошта вы разбілі краіну? Ну добра, у зман вас увялі амерыканцы. Але чаму цяпер не асудзілі тое, што здарылася? Чаму цяпер не кажаце, што апора дэмакратыі — гэта бандытызм? Чаму вы гэта не зрабілі?» — адрасаваў Аляксандр Лукашэнка гэтыя пытанні вышэйшаму кіраўніцтву краін і грамадству.

«Якія вы добрыя дэмакраты, калі гэта датычыцца, дапусцім, Беларусі, у нейкай ступені Расіі. Але як вы зашораныя, калі тыя ж працэсы адбываюцца ў Еўропе, калі выкарыстоўваюць слёзатачывы газ і вадамёты для разгону дэманстрантаў у Францыі, Германіі, чаго ў Беларусі ніколі не было. Чаму не крытыкуеце тыя дзяржавы? Чаму яны дэмакратычныя, а мы не? Мабыць, камусьці не хочацца... Ну і калі шчыра казаць, не такія вы ўжо незалежныя, як вы сябе пазіцыянуеце. Напэўна, нехта вамі кіруе», — рэзюмаваў Прэзідэнт.

У час гутаркі з прэсай было закранута і пытанне прыватызацыі беларускіх прадпрыемстваў. Прэзідэнт адзначыў, што гатовы падтрымаць прыватызацыю «Нафтана» і «Паліміра». «Калі ў вас ёсць грошы і жаданне — прыязджайце, я гатовы падтрымаць праграму па прыватызацыі беларускага нафтаперапрацоўчага аб'яднання», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. Ён таксама дадаў, што кошт прадпрыемства ацэньваецца ў суму амаль $3 млрд. Гаворачы ж у цэлым аб прыватызацыі ў Беларусі, ён нагадаў, што яна не мела абвальнага характару, а была кропкавай. У той жа час Беларусь не мае намеру аддаваць у чужыя рукі добра працуючыя, рэнтабельныя кампаніі.

Падагульняючы размову з журналістамі, Прэзідэнт падкрэсліў, што ў дыялогу з Еўропай Беларусі не патрэбны адвакаты і пасрэднікі. Пры гэтым Аляксандр Лукашэнка дадаў, што Беларусь гатова прыняць любую дапамогу ад любой еўрапейскай краіны. Ён таксама адзначыў, што і Літва, і Польшча аказалі апошнім часам неабходнае садзейнічанне ў выбудоўванні адносінаў з Еўропай.

Паводле паведамленняў прэс-службы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і БЕЛТА.

«НЕ СПЯШАЙЦЕСЯ РАСКІДВАЦЦА ГРАШЫМА, ЧАСАМ І СВАІМІ ПАРТНЁРАМІ»

Раяць, як дзяржаўным, так і прыватным прадпрыемствам старшыні гаспадарчых судоў рэспублікі. І рэкамендуюць не імчаць на злом галавы ў суд, а паспрабаваць, не даводзячы спрэчку да канфлікту, вырашыць яе альтэрнатыўным спосабам.

Працэдура пасрэдніцтва, як альтэрнатыўны спосаб вырашэння эканамічных спрэчак, прапісана ў Гаспадарчым працэсуальным кодэксе з 2005 года. Але на практыцы прымяняецца гаспадарчымі судамі толькі крыху больш за год. За гэты час праз працэдуру пасрэдніцтва прайшло каля 8,5 тысячы спраў, з якіх у 85 % выпадкаў спрэчкі скончыліся міравым пагадненнем. Гэта дастаткова высокі паказчык.

— Сёння мы перажываем не самы лепшы час, — **адзначыў старшыня Вышэйшага гаспадарчага суда Беларусі Віктар КАМЯНКОЎ.** — У сувязі з сусветным фінансава-эканамічным крызісам сёлета значна павялічылася колькасць зваротаў суб'ектаў гаспадарання і дзяржаўных органаў у гаспадарчыя суды. Толькі за паўгода іх агульная колькасць перасягнула пяцьдзесят тысяч. Адпаведна павялічылася ажно да 97 спраў і сярэднямесячная нагрузка на аднаго суддзю. Замест таго, каб прасіць аб павелічэнні колькасці суддзяў, мы прапанавалі спрасціць многія працэдуры разгляду гаспадарчых спрэчак. У прыватнасці пачаць яшчэ больш актыўна выкарыстоўваць інстытут пасрэдніцтва пры ўрэгуляванні ўзніклых канфліктных сітуацый.

Перавага апошняга відавочная, — уступае ў размову **старшыня гаспадарчага суда Мінскай вобласці Анатоль ГАРНОЎСКІ.** — Па-першае, эканомяцца грошы, па-другое, эканоміцца час і нервы, па-трэцяе, што таксама немалаважна, захоўваюцца добрыя партнёрскія адносіны. На сёння буйныя прадпрыемствы Мінскай вобласці, той жа «БЕЛАЗ», «Беларуськалій», дзе добра развіта юрыдычная служба, з задавальненнем карыстаюцца паслугамі пасрэдніка. Яны ведаюць, што незацікаўленая асоба (пасрэднік — работнік гаспадарчага суда ў адрозненне ад суддзі не мае права выносіць рашэнне) за сімвалічную суму дапаможа ім заключыць міравое пагадненне, максімальна выгаднае для абодвух бакоў.

Паводле слоў **Віктара КАМЯНКОВА,** наіўна спадзявацца, што пасля крызісу колькасць гаспадарчых спрэчак зменшыцца, таму трэба ўдасканальваць працэдуру пасрэдніцтва.

— Якраз гэтым мы зараз і займаемся, — кажа старшыня Вышэйшага гаспадарчага суда Беларусі. — Калі казаць больш канкрэтна, то рыхтуем праект закона, каб як мага хутчэй унесці змяненні ў наш Працэсуальны кодэкс. Што гэта за змяненні? Выступаем за з'яўленне ў Беларусі трацейскіх судоў. Але гэта будзе магчыма толькі пасля прыняцця закона аб трацейскіх судах. Менавіта новы закон дазволіць стварыць гэтыя суды свабодна. Пакуль жа ў Беларусі ёсць толькі адна падобная структура — пры Гандлёва-прамысловай палаце. Акрамя таго, пры Беларускім саюзе юрыстаў з'явіцца і спартыўны суд. Што датычыцца прававаднасінаў у спартыўнай сферы, то тут «поле не ўзаранае». Я лічу, што многія прававыя акты, якія датычацца сферы спорту, трэба наогул мяняць.

Пасрэдніцтва ў праекце закона разглядаецца настолькі шырока, што яно будзе прымяняцца на ўсіх стадыях судаводства.

— Нават калі ёсць рашэнне суда і яго трэба прымусова выконваць, бакі змогуць пры ўзаемнай згодзе завяршыць справу міравым пагадненнем, — адзначае Віктар Камянкоў. — Больш за тое, прапаноўваем увесці ў заканадаўства яшчэ і працэдуру дасудовага пасрэдніцтва, паўнамоцтвы правядзення якой перадаць юрыдычным фірмам. Акрамя таго, у праекце закона мы прапісалі, што перад тым, як звярнуцца ў суд, суб'екты гаспадарання абавязкова павінны сустрэцца і пагаварыць.

— Ведаеце, на жаль, нашы кіраўнікі прадпрыемстваў раённага, і нават абласнога ўзроўню лічаць ніжэй сваёй годнасці прыйсці з павіннай да кампаньёна, — падзяліўся ўласнымі назіраннямі **старшыня гаспадарчага суда Гродзенскай вобласці Валерый КАСЦЮКЕВІЧ.** — І, тым самым, вырашаючы пытанне праз суд, прайграюць у першую чаргу эканамічна. Прывяду дзеля прыкладу толькі адну сітуацыю. ААТ «Лідахлебапрадукт» падало іск на свайго партнёра-даўжніка — Лідскую птушкафабрыку. Гаворка ішла аб істотнай суме — 1,7 мільярда рублёў. Я запрасіў да сябе абодвух кіраўнікоў і 30 хвілін перакonваў іх, што абодвум бакам выгадней заключыць міравое пагадненне. «Вы праз суд атрымаеце свае грошы, але праз гадоў пяць ці шэсць, бо ў чарзе стаіце дзявятым. Калі ж заключыце міравое пагадненне, то зможаце атрымліваць па 20 мільёнаў штомесяц і ўкладаць іх у вытворчасць, — звярнуўся я да дырэктара «Лідахлебапрадукта». У выніку яны заключылі міравое пагадненне, згодна з якім Лідская птушкафабрыка павінна выплаціць доўг з растэрміноўкай за паўтара года.

— Валерый Яўгенавіч мае рацыю, трэба тлумачыць кіраўнікам прадпрыемстваў перавагі такой працэдуры, як пасрэдніцтва, — кажа Віктар Камянкоў. — Хацелася б, каб нам у гэтым дапамагалі і органы мясцовай улады. Акрамя таго, мы ідзём насустрач грамадзянам і прапаноўваем новую шкалу па дзяржаўнай пошліне. Калі гаворка ідзе аб вялікіх сумах, як у вышэйпрыведзенай сітуацыі, то дзяржаўная пошліна будзе нізкай. Чым меншая сума грошай з'яўляецца віной спрэчкі (калі яшчэ пры гэтым бакі не спрабавалі ўрэгуляваць спрэчку ў дасудовым парадку), тым большая прадугледжваецца дзяржаўная пошліна.

Надзея ДРЫЛА.

Хто што сказаў учора...

Беніта Ферэра-ВАЛЬДНЕР,
камісар Еўрасаюза па знешніх сувязях і палітыцы добрасуседства — **пра перспектывы узаемаадносінаў ЕС і Беларусі:**

— ЕС стане добрым партнёрам для Беларусі. Гэта партнёрства складаецца з двухбаковых праграм па лініі «Усходняга партнёрства» і еўрапейскай палітыкі суседства. Калі казаць больш канкрэтна, такое партнёрства будзе складацца з палягчэння візавага рэжыму і спрашчэння правілаў для паездак грамадзян Беларусі ў краіны ЕС, а таксама ўмацаванне гандлёвых сувязяў.

Рэспубліканскі цэнтр гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя — пра тое, **як харчуюцца беларусы:**

У рацыёне беларусаў пераважае празмерна каларыйная ежа з вялікай колькасцю насычаных тлушчаў, халестэрыну, рафінаванага цукру, солі і алкаголю. У той жа час недастаткова поліненасычаных тлушчаў, складаных вугляводаў, харчовых валокнаў, вітамінаў і мінералаў. Гэта спрыяе ўзнікненню такіх захворванняў, як ішэмічная хвароба сэрца, артэрыяльная гіпертэнзія, хранічныя неспецыфічныя захворванні лёгкіх, цукровы дыябет, анкалагічныя захворванні і многія іншыя. Чалавек павінен усвядоміць неабходнасць прытрымлівацца правільнага харчавання, навучыцца аналізаваць свой харчовы рэжым і ўносіць у яго карэктывы, набліжаючы да аптымальнага.

Уладзімір ДАВІДОВІЧ,
дырэктар агенцтва нерухомасці «Твая сталіца» — **пра сітуацыю на жыллёвым рынку:**

— Сітуацыя на рынку сталічнага жылля стабілізавалася і застанецца такой прынамсі да Новага года. З-за дарагавізны на рашэнне жыллёвага пытання амаль перасталі выкарыстоўвацца крэдытныя грошы, што абмяжоўвае попыт. У той жа час ідзе актыўнае жыллёвае будаўніцтва, што падсілкоўвае прапанову. Мы са стрыманым аптымізмам глядзім наперад.

Абзац

◢ На змену цёпламу надвор'ю ў Беларусі ідзе пахаладанне. Па звестках сіноптыкаў, у выхадныя краіна апынецца ва ўладзе антыцыклону. Ноччу месцамі ўжо магчымыя замаразкі. Так, у ноч на 19 верасня будзе 1—7 градусаў цяпла, а месцамі — да 0 — мінус 2. Суботнім днём чакаецца 12—19 градусаў цяпла, халаднавата будзе і ў ноч на нядзелю — 2—8 градусаў вышэй за нуль, на тарфяніках Палесся — ад 0 да мінус 2 . У нядзелю ўдзень будзе 15—21 градус. У пачатку наступнага тыдня крыху пацяплее — ноччу 3—8 градусаў, удзень — 17—22. Ападкаў не чакаецца. Яны пройдуць, як мяркуецца, у сярэдзіне наступнага тыдня на паўночным захадзе. 23 верасня чакаецца 17—24 градусы.

◢ **Работнікі праваахоўных органаў затрымалі ў Магілёве кіраўнікоў двух прыватных прадпрыемстваў пры атрыманні хабару ў асабліва буйным памеры. Кіраўнік прыватнага прадпрыемства «Рэгенератарны завод» у змове з кіраўніком іншага прыватнага прадпрыемства за спрыяльнае вырашэнне пытання аб заключэнні дагавора карыстання складам «Рэгенератарнага завода» з наступным выкупам прынялі ад індывідуальнага прадпрымальніка хабар у памеры $130 000. Заведзена крымінальная справа.**

◢ У Маладзечне махляры шляхам SMS разыгрывалі «бумеры». 39-гадовая жыхарка горада звярнулася ў праваахоўныя органы з заявай пра тое, што невядомы прыслаў ёй SMS аб выйгрышы БМВ Х5. Для атрымання аўтамабіля зламыснік пераконваў жанчыну аплаціць транспартныя расходы па дастаўцы машыны. Усё, што ад яе патрабавалася, — перавесці ў банк Вгз млн 920 тыс. Па факце распачата крымінальная справа.

◢ **Да 15 гадоў пазбаўлення волі пагражае пастаўскаму бізнэсмену за спробу забойства свайго партнёра. Калі паміж двума партнёрамі пачаліся рознагалоссі, адзін з іх, жыхар Паставаў 1975 г.н., заманіў яхвяру ў лес і расстраляў. Пацярпелага выратавала яго жонка. Пасля тэлефоннага званка мужа пра тое, што ён едзе «на разборкі», жанчына сама адправілася на яго пошукі. На дарозе каля вёскі Юнькі яна знайшла сямейны аўтамабіль, а побач — мужа без прытомнасці. Дзякуючы своечасова аказанай медыцынскай дапамозе 26-гадовы мужчына, які атрымаў два цяжкія агнястрэльныя раненні галавы і брушной поласці, застаўся жывы. Супрацоўнікі міліцыі і пракуратуры раёна хутка вылічылі і затрымалі падазронага.**

Поўны абзац

◢ Самым высокім чалавекам у свеце прызнаны грамадзянін Турцыі Султан Касен, рост якога складае 2 м 47 см. Адпаведны запіс з'явіцца ў выданні «Кнігі рэкордаў Гінэса» за 2010 год. Папярэдні рэкардсмен, украінец Леанід Стаднік ростам 2 м 57 см, страціў сваё званне, паколькі адмовіўся прайсці паўторнае вымярэнне. Па яго словах, ён стаміўся ад празмернай увагі з боку навакольных. Паведамляецца, што незвычайны рост Касена абумоўлены наяўнасцю ў яго рэдкага захворвання, гіпофізнага гігантызму. Летась яму была зробленая аперацыя, пасля якой, як чакаецца, яго рост спыніцца.

◢ **Упершыню ў Расіі выдадуць падручнік па пахавальнай справе. Сталічныя ўлады плануюць стварыць да канца года двухтомны падручнік па гэтай тэме. Такая кніга выдаецца ў Расіі ўпершыню. Гэтае выданне, лічаць у дэпартаменце спажывецкага рынку і паслуг Масквы, стане асноўным навучальным дапаможнікам для працаўнікоў сферы рытуальных паслуг.**

Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.

ЯК СКРАЛІ БУЛЬБУ З... «ЯБЛЫНЬКІ»

У Глыбоцкі раённы аддзел унутраных спраў з адміністрацыі сельскагаспадарчага прадпрыемства «Яблынька» паведамілі, што раніцай нехта з поля, якое належыць гаспадарцы, скраў больш за 450 кілаграмаў бульбы. Міліцыянеры даволі хутка высветлілі, што выкапалі незаконна бульбу два беспрацоўныя, адзін з якіх раней судзімы. Скрадзеную бульбу, якую ў гаспадарцы ацанілі прыкладна ў 460 тысяч рублёў, знайшлі і канфіскавалі. Узбуджана крымінальная справа.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

КІНУЎСЯ ПАД ГРУЗАВІК?..

Усе акалічнасці дарожна-транспартнага здарэння, якое адбылося днём на Мінскай кальцавой аўтадарозе і ў якім загінуў пешаход, зараз высвятляюцца: не ўсё адназначна ў гэтым ДТЗ.

Паводле звестак аддзела па агітацыі і прапагандзе ДАІ ГУУС Мінгарвыканкама, напачатку трэцяй дня на 16-м кіламетры МКАД пад аўтамабіль КАМАЗ трапіў 57-гадовы мужчына, які перасякаў дарогу па-за пешаходным пераходам. Мужчына загінуў на месцы. Як сцвярджаюць відавочцы здарэння, смерць чалавека была невыпадковай: маўляў, ён наўмысна кінуўся пад колы.

Ігар ГРЫШЫН.

Герой і «герой»

ПА ДАРОЗЕ НА РЫНАК ВЫРАТАВАЎ ЖЫЦЦІ

Сяргей Машкоўскі, 27-гадовы крычаўскі выратавальнік, вынес з пажару двух мужчын

12 верасня раніцай у вёсцы Калініна Крычаўскага раёна загарэўся дом. З вокнаў стаў прабівацца дым, вакол сабраўся народ. Усе ведалі, што там могуць быць людзі, але ніхто не мог рашыцца ўвайсці ў дом з рызыкай для свайго жыцця.

Выпадкова побач з месцам пажару апынуўся Сяргей, які толькі раніцай змяніўся з дзяжурства ў Крычаўскай пажарнай аварыйна-выратавальнай часці № 1 і разам з жонкай і маленькім сынам ехаў на рынак па пакупкі. Ён убачыў натоўп і дым, усё зразумеў і кінуўся ў дом. Ён вынес 64-гадовага гаспадара дома і яшчэ аднаго мужчыну. Смелы ўчынак Сяргея выратаваў ім жыцці.

Як паведамілі ў Магілёўскім абласным управленні МНС, да пажару давяла непатушаная цыгарэта, ад якой стала тлець бялізна на ложку. Пакоі зацягнула дымам, і самастойна мужчыны выбрацца з дому не здолелі.

Сын Сяргея 4-гадовы Ягор расказаў у дзіцячым садку пра тое, як яго бацька вынес з дыму на руках двух чалавек, і заявіў, што стане выратавальнікам,

каб разам з бацькам тушыць пажары і дапамагаць людзям. Сам Сяргей сціпла паведаміў, што героем сябе зусім не лічыць, а ў той момант думаў толькі пра тое, што нехта трапіў у бяду і патрэбна яго дапамога.

Ілона ІВАНОВА.

ПАБІЎ ВАДЗІЦЕЛЯ МАРШРУТКІ

У маршрутцы Віцебск — Полацк 62-гадовы жыхар абласнога цэнтра, як кажуць, павёў сябе неадэкватна і агрэсіўна — пабіў кіроўцу.

Як расказала «Звяздзе» памочнік пракурора Віцебскага раёна Наталля Сеўрукова, гэты пасажыр сеў у маршрутку на віцебскім аўтавакзале ў нецвярозым стане. Амаль усю дарогу спаў, як малы. А потым раптам прачнуўся і пачаў крычаць вадзіцелю: «Куды ты мяне вязеш?» Падышоў да вадзіцеля і ўдарыў кулаком у нос. Вадзіцель праявіў увесь свой прафесіяналізм — літаральна інтуітыўна затармазіў. Калі маршрутка спынілася, мужчыны выцягнулі хулігана на вуліцу, спрабавалі супакоіць, Але толькі дарма час патрацілі. Вадзіцелю давялося выклікаць міліцыю...

Абвінавачаны на судзе шкадаваў пра тое, што зрабіў, каяўся. Заплаціў хуліган-пенсіянер штраф у памеры 30 базавых велічынь (1 мільён 50 тысяч рублёў) і кампенсаваў вадзіцелю маральную шкоду: 800 тысяч рублёў.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

Прамая лінія

ДЗЯЦІНСТВА З АЛЕРГІЯЙ

На пытанні чытачоў адказаў доктар медыцынскіх навук, прафесар, загадчык кафедры паліклінічнай педыятрыі Беларускай медыцынскай акадэміі паслядыпломнай адукацыі Уладзімір ЖАРНАСЕК

(Працяг. Пачатак у нумарах за 16 і 17 верасня.)

☎— Жыткавічы, Таццяна. Дзіцяці — 3 месяцы. З 2 месяцаў яму стала цяжка дыхаць носам. Слізі ў носе няма. Нам рэкамендавалі прэпарат салін, але ён не зусім дапамагае. Толькі на нейкі час. Можа быць, у дзіцяці ўжо алергія?

— У сваякоў ёсць алергічныя захворванні?

— У мяне ёсць алергічны насмарк на хатні пыл.

— У дзіцяці скураныя праявы ёсць?

— Няма.

— Алергічнага працэсу з боку носа да 6 месяцаў практычна не бывае. Цяжкае дыханне ў вашага дзіцяці — не алергія. Аб алергічным працэсе першага года жыцця з боку дыхальных шляхоў можна думаць толькі тады, калі ёсць цяжкая скураная алергія. Калі гэтага няма, то нават думаць аб алергіі з боку носа ў дзіцяці першага году жыцця не выпадае. Прычына можа быць у прыроджанай вузкасці насавых хадоў. Пакуль дзіця не падрасце, насавыя хады поўнасцю не сфарміруюцца, такая сітуацыя, на жаль, захаваецца. Меры барацьбы — кантроль мікраклімату ў памяшканні, дзе знаходзіцца дзіця. Дрэнна, калі паветра перасушанае. Часам дапамагае ўвільгатненне паветра і слізістай носа. Для гэтага выкарыстоўвайце той жа салін некалькі разоў на дзень. Кампенсацыя надыходзіць звычайна пасля 6 месяцаў. Калі насавое дыханне з узростам не будзе паляпшацца, трэба паказацца лор-урачу, паколькі бываюць і іншыя прыроджаныя праблемы.

— Да 3 гадоў не абследуюць на алергію?

— Абследаваць на павышаную адчувальнасць да алергенаў можна ў любым узросце. Іншая рэч, які метад для гэтага выбраць і наколькі ён даступны. На практыцы найбольш даступнымі з'яўляюцца скураныя пробы з алергенамі. Яны ставяцца дзецям з 2 гадоў. Гэта тлумачыцца асаблівасцямі адчувальнасці скуры. Пробы не будуць інфарматыўнымі ў больш раннім узросце. А вось прабірачныя тэсты «Інвітра» можна праводзіць пасля 1 года. Гэты від даследавання найбольш аптымальны, але і больш дарагі, складаны. Таму сёння яго можна выканаць у камерцыйных цэнтрах любога абласнога цэнтра на платнай аснове.

☎— Мінск, Ірына. Скажыце, а чаму пробы бываюць супярэчлівымі?

— Адмоўныя скураныя пробы не выключаюць алергіі, таму што гэта апасродкаваны метад дыягностыкі. Станоўчыя пробы, зразумела ж, пацвярджаюць алергію. У нашай краіне мы маем справу з водна-салявымі экстрактамі алергенаў расійскай вытворчасці. Выпускаюцца ж гэтыя экстракты ў розных серыях. Адна серыя, напрыклад, выраблена з нейкага канкрэтнага пылку раслін або канкрэтнай порцыі пылу. Другая серыя будзе з другіх порцый пылку ці пылу. Таму дыягнастычная каштоўнасць тэстаў можа быць розная, не супадаць з тым, што ёсць у чалавека дома. У свеце існуюць і больш дакладныя сродкі дыягностыкі, але наша краіна іх не атрымлівае.

☎— Масты, Ірына Станіславаўна. Унучцы — 3 гады. У яе чырванее горла, з носу цячэ. Высыпанні на скуры былі, моцны кашаль...

— А дзіця падчас гэтых пагаршэнняў не дае тэмпературы?

— Не, тэмпературы няма.

— А ноччу дыхае носам?

— Быццам бы, так.

— Як доўга насмарк трымаецца?

— З тыдзень.

— Што дапамагае ад насмарку?

— Дакладна не памятаю, але ж многія прэпараты прымянялі. Можа, нам трэба дадаткова абследавацца, каб выявіць прычыну такіх пагаршэнняў?

— У Гродне нядрэнна арганізавана алергалагічная служба. Ёсць амбулаторны прыём, ёсць і алергалагічныя ложкі ў абласной дзіцячай клінічнай бальніцы. Скураныя пробы вам ставілі?

— Ставілі. Яны адмоўныя. Толькі на пылок пакуль не ставілі.

— Іх звычайна робяць з канца кастрычніка. А ці ёсць у гэтых пагаршэнняў сезонныя праявы?

— Зімой быццам бы лягчэй.

— Тады першае, што варта зрабіць, — паставіць пробы з пылковымі алергенамі. Калі яны будуць адмоўнымі, што бывае пры яўным алергічным захворванні і асаблівай адчувальнасці скуры, тады трэба абследавацца прабірачнымі тэстамі ў камерцыйным медыцынскім цэнтры, які праводзіць дыягностыку алергіі па крыві. Гэта выконваецца на ўзроўні вобласці. Алергічны рыніт часцей за ўсё звязаны з умоўнай пражыванню, хатнімі алергенамі. Перш-наперш гэта хатні пыл, мікракляшчы, перхаць хатніх жывёл... У тым ліку і пылок раслін. У апошнім выпадку пробы прынцыпова важныя, паколькі тады адкрываецца магчымасць лячэння алергенам, які ўводзіцца ў арганізм па спецыяльным метадзе ў дозах, якія паступова нарошчваюцца, каб зрабіць чалавека неадчувальным да алергену. У любым выпадку патрэбнае медыкаментознае лячэнне — паўторныя курсы супрацьзапаленчых прэпаратаў. Гарманальных ці негарманальных. Каб высветліць, што паказана вашаму дзіцяці, яго трэба бачыць. Пакуль рабіце пробы, прабірачныя тэсты.

— А можна потым звярнуцца да вас?

— Калі ласка. Па накіраванні лячэбнай установы, дзе назіраецца ваша дзіця, у кансультацыйную паліклініку Мінскай абласной дзіцячай клінічнай бальніцы. Тэлефон для папярэдняга запісу 265 20 53. Або на платнай падставе ў Прафесарска-кансультацыйны цэнтр Беларускай акадэміі паслядыпломнай адукацыі на базе Рэспубліканскага цэнтра медыцынскай рэабілітацыі і бальнеалячэння. Тэлефон 219 36 15.

Святлана БАРЫСЕНКА, Вольга ШАЎКО.
(Працяг будзе).

Футбол

«АРСЕНАЛ» І «ДЫНАМА» ПАКАЗВАЮЦЬ ХАРАКТАР

Другі гульнявы дзень групавога раўнда Лігі чэмпіёнаў прынёс вынікі, якія, у асноўным, і чакаліся. З васьмі матчаў серады асобна стаяць толькі дзве цікавыя і напружаныя сустрэчы — «Стандарта» з «Арс

Заснавальнік — установа «Рэдакцыя газеты «Звязда» і грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 12 ад 19 лютага 2009 г.

18
ВЕРАСНЯ
2009 г.
ПЯТНІЦА
№ 35 (15589)

ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА

ТРОХГРАШОВАЯ ГІСТОРЫЯ

Вяртаючыся з адпачынку, мы часта прывозім з сабою тую ці іншую суму ў замежнай валюце. І добра, калі гэта звычныя паперкі доларaў ці еўра. Іх можна здаць у любым аддзяленні банку. А што рабіць, калі ў кішэні выпадкова завaляліся «металічныя» грошы — манеты — ці якія-небудзь экзатычныя казахскія тэнге або турэцкія ліры? Наш карэспандэнт даведаўся пра гэта ў сталічных банках.

ЕЎРАЦЭНТ ЕЎРА БЕРАЖЭ,
ЦІ ДЗЕ МОЖНА АБМЯНЯЦЬ МАНЕТЫ ЗАМЕЖНЫХ ВАЛЮТ

Перада мною ляжаў спіс з амаль трыццаці назваў банкаў. Ну, думаю, без праблем знайду тых, хто можа выратаваць. Побач — мяшочак з замежнымі «капейкамі» (еўрацэнты, польскія злотыя, чэшскія кроны), якія засталіся з розных падарожжаў. Паасобку і праўда невялічкія грошы, але ўсе разам складалі даволі значную суму. Адным словам, Бураціна аб такім багацці нават і не марыў.

Першыя некалькі тэлефонных званкоў былі няўдалымі. З таго боку тэлефоннай трубкі цярпліва выслухоўвалі маю праблему, а потым мілым голасам адразалі: «Не, наш банк гэтым не займаецца». Больш падрабязна растлумачыў сітуацыю прадстаўнік БПС-банка: «Нацыянальны банк Рэспублікі Беларусь афіцыйным лістом дазволіў усім банкам не праводзіць аперацый з металічнымі грашыма. А калі ёсць дазвол, то каму трэба браць на сябе дадатковую працу? Мы нікуды не вывозім манеты, і каб нам іх здавалі, то яны засталіся б ляжаць у нас «мёртвым грузам»».

Але надзея не пакідала мяне, «дазвол не працаваць» — гэта ўсё ж не «забарона працаваць», нехта абавязкова павінен знайсціся! Тэлефаную ў «Беларусбанк». Мяне перанакіроўваць ад аднаго аператара да другога, потым да трэцяга, але нарэшце ў трубцы чуюцца запаветныя словы: «Так, наш банк займаецца абменам манет. Але толькі еўра і расійскіх рублёў. Звяртайцеся ў касу на вуліцы **Мяснікова**, 32. Працуе па буднях з 8:30 да 15:00». Ужо хоць нешта. Але польскі і чэшскі «метал» усё яшчэ сіратліва паглядаў на мяне. Няўжо, перасякаючы беларускую мяжу, яны ператвараюцца ў жалеззе? На жаль, так. Ніводны з мінскіх банкаў нічым парадаваць мяне не змог. Лаканічнае «не» ці больш ветлівае «на жаль, не» — і на гэтым усё.

Як выснова: калі вяртаецеся з замежжа, не забывайце абмяняць манеты на папяровыя грошы ці прыдбайце што-небудзь на апошнія «капейкі».

ЛЕЎ СУПРАЦЬ СОМА,
ЦІ ДЗЕ МОЖНА НАБЫЦЬ ЭКЗАТЫЧНУЮ ВАЛЮТУ

Заўсёды ёсць універсальны спосаб ехаць за мяжу з амерыканскімі доларамі. Але калі фінансавы крызіс на вас не надта паўплываў і вы едзеце за мяжу са значнай сумай, то такія двайныя абмены могуць шмат адняць. Лепш адразу з беларускай валюты пераводзіць, напрыклад, у балгарскі леў. Але таксама не ўсе банкі могуць у гэтым дапамагчы. І калі Нацыянальны банк нашай краіны кожны дзень вызначае курсы дваццаці сямі замежных валют, то рэальна набыць можна толькі частку з іх.

«Беларусбанк» прапануе японскія іены, канадскія долары, кітайскія юані, шведскія і дацкія кроны. Звяртацца на Мяснікова, 32.

У БТА-банку на вуліцы Веры Харужай можна набыць казахскія тэнге і швейцарскія франкі.

Балгарскія левы, турэцкія ліры, дацкія, чэшскія і шведскія кроны можна набыць на **Гікалы, 3** у ВТБ-банку. Але, як паведамілі нам там, валюта спецыяльна не купляецца, і з'яўляецца толькі тады, калі хтосьці здае яе ў касы.

БПС-банк прапануе аўстралійскія і канадскія долары, нарвежскія, чэшскія і шведскія кроны, японскія іены і кітайскія юані. Цэнтральны апарат знаходзіцца на бульвары **Мулявіна, 6**.

Той самы набор валют можна знайсці і ў Белзнешэканамбанку на Мяснікова, 32.

Мінскі транзітны банк прапануе балгарскія левы, турэцкія ліры, чэшскія, шведскія і нарвежскія кроны, аўстралійскія і канадскія долары. Цэнтральная каса знаходзіцца на Партызанскім праспекце, 6А.

Яўген ВАРАКСА.

Споведзь «пералётнай птушкі»

Падпрацоўка для студэнта — звычайная рэч, асабліва летам. Вось толькі месца, на якім давядзецца правесці каштоўныя летнія гадзіны, можа быць не заўсёды такім звычайным, ды яшчэ і паспрабуй яго знайсці. Кожны з нас, сабраўшыся ў верасні ў аўдыторыі, стараецца і сваім асабістым досведам падзяліцца, і навіны сяброў паслухаць: хто дзе працаваў, з кім пазнаёміўся, куды з'ездзіў і нешта накшталт таго. Нехта правёў лета, ажыццявіўшы жаданае ўзімку, падчас пражывання ў інтэрнаце, трохбор'е: дыван, халадзільнік і тэлевізар. А некаму не хапала часу нават на сон, паколькі ўсё было адведзена пад працу. Выбар кожны для сябе зрабіў сам, адпаведна і ўражанні ад адпачынку ў кожнага свае.

У маёй групе навучаецца дзяўчына, **Барбосава Насця** (мы яе любячы называем Настасся Паўлаўна), якая не толькі гэтым летам, але і мінулым таксама вырашыла сказаць цвёрдае і ўпэўненае «не» сумным будням каля тэлевізара падчас летніх канікулаў. Дыскатэкі, вечаровыя пасядзелкі на лавачках з сябрамі, пляскане ў возеры — гэта ўсё тое, што яна ўжо праходзіла не аднойчы і таму вырашыла крыху змяніць кірунак адпачынку, так бы мовіць, сумясціць два ў адным: і адпачыць, і грошы зарабіць.

(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)

Свая справа

Казка з Барсукоў

Клімавіцкія прадпрымальнікі робяць эксклюзіўныя хаты і лазні ў народным стылі

Вёска на памежжы, паварот на бярозавую алею, удалечыню ідзе бетонка. Дарога хоць і зарослая травой, там-сям падлатаная, але трывалая, зробленая вайскоўцамі калі не на стагоддзі, то на доўгія дзесяцігоддзі дакладна. У Барсуках за савецкім часам стаяла ваенная часць супрацьпаветранай абароны: на жалезных варотах яшчэ савецкая сімволіка, але тут ужо гаспадараць прыватнікі.

Паўтара кіламетра ад аўтатрасы, якая звязвае Беларусь і Расію, — і шум аўтамабіляў змяняецца трасканінай бензапілаў. Маладыя рабочыя працуюць пасярод тоўстых бярвенняў і зрубаў, якія нагадваюць ілюстрацыі да народных лубачных казак. Хаты, лазні, альтанкі зроблены з круглага дрэва дыяметрам 35-40 сантыметраў.

— Гэта эксклюзіў для заможных людзей, якія хочуць здзівіць сваіх сяброў і знаёмых, — паказвае прадпрымальнік Сяргей Давыдаў. — Нам такія збудаванні замаўляюць у асноўным са сталіцы і Мінскай вобласці. Вось лазня, якая прадаецца: з сасны, прыгожая, магутная, з адкрытай тэрасай і барнай стойкай. Падабаецца ўсім, але каштуе тры дзясяткі мільёнаў рублёў. Нядаўна прадалі адну. Нашу прадукцыю можна паглядзець у інтэрнэце.

Сяргей Уладзіміравіч — жыхар Клімавічаў. Першым у раёне заняўся прыватным гандлем аўтазапчасткамі. Цяпер вырашыў заняцца сур'ёзнай вытворчай працай.

Напярэдадні новага 2009 года, калі ўвесь свет не столькі святкаваў, колькі журыўся з прычыны глабальнага эканамічнага крызісу і меркаваў аб выжыванні ў такіх складаных варунках, два клімавіцкія прадпрымальнікі, партнёры Давыдаў і Фралоў, у выніку аукцыёну атрымалі ўласнасць. І хоць заплаціць за яе давялося сімвалічную суму ў адну базавую велічыню, але за падарунак тэрыторыю былой вайсковай часці прыватнікі не лічылі. Хутчэй — за першы крок да актыўных дзеянняў.

— Нам у Клімавіцкім райвыканкаме падказалі купіць: 12 кіламетраў ад райцэнтра, прыгажосць і цішыня, магчымасць развівацца, — гаворыць Сяргей Уладзіміравіч. — Мы скарысталі гэту каштоўную параду мясцовых уладаў. І не шкадуем.

Давыдаў заўсёды кажа, што валодае толькі сваімі рукамі. Цяпер да гэтага дадалася тэрыторыя ў 15 гектараў. Трэба сказаць, куток тут маляўнічы. Старыя вайсковыя будынкі давядзецца капітальна рамантаваць, затое пасаджаныя салдатамі бярозкі вымахалі пад неба, грыбоў і ягад у ляску досыць, а каля невялікай сажалкі добра глядзеліся б гасцявыя хаткі, альтанкі і лясная кавярня для вандроўнікаў. Тым больш, што ад афіцэрскага жылля яшчэ засталіся трывалыя падмуркі. Так што мэта прадпрымальнікаў — не толькі вытворчасць наладзіць, але ў будучыні і добрае турыстычнае месца зрабіць.

— Я па прафесіі мастак, працаваў афарміцелем і добра ведаю, дзе патрэбныя дакладнасць і тонкасць, каб атрымалася прыгажосць, — расказвае прадпрымальнік.

Тады, можа, пайсці далей? Напрыклад, распісваць лазні ды альтанкі. Пад палехскую шкатулку, народнымі беларускімі ўзорамі альбо вінтажнай савецкай сімволікай?

— Будзе попыт — зробім, — не адмятае ідэю Давыдаў.

Пакуль клімавіцкія прадпрымальнікі яшчэ толькі ў пачатку свайго шляху — працуюць менш за паўгода. За ўласныя сродкі набылі абсталяванне і нанялі людзей. Сёння на будаўнічай пляцоўцы працуюць 13 чалавек. На новых працоўных месцах плацяць ад 300 да 500 тысяч рублёў, і ў дадатак прэміі лепшым работнікам.

Маладыя людзі працуюць спрытна, трэскі ляцяць ва ўсе бакі. Яны цяпер рубяць хату па новай тэхналогіі: не габлююць, а шліфуюць, каб была бачная прыгожая структура дрэва, усе сучкі і прыродная крывізна.

У дадатак да лазняў і хатаў, а таксама турыстычных паслугаў, у клімавіцкіх прадпрымальнікаў ёсць ідэя запрасіць да сябе народных майстроў. Іх цікавяць старажытныя тэхналогіі ткацтва, ганчарнае майстэрства і іншыя. Таму што попыт на такія рэчы будзе не толькі ў прыезджых турыстаў, але і ў людзей, якія замаўляюць сабе драўляныя збудаванні. Лазню з тоўстага дрэва лагічна дапоўніць вясковымі дыванамі і гліняным посудам у народным стылі.

Прыватнікі таксама зразумелі, што людзі хочуць набываць дамы ці лазні «пад ключ» і не цягацца дзеля агляду будучай уласнасці на беларуска-расійскае памежжа. Для гэтага сёння Фралоў і Давыдаў шукаюць партнёраў у Мінску: каб у Барсуках рабіць драўляныя зрубы, а ў сталіцы — падмуркі і дахі.



Сяргей ДАВЫДАЎ паказвае клімавіцкі эксклюзіў — хату нібыта з казкі.



Маладыя людзі працуюць, толькі трэскі ва ўсе бакі ляцяць.

Увогуле ТАА «ХарчБудТэхСэрвіс» мае такую назву, што для развіцця прадпрыемства проста няма межаў: напрыклад, партнёр Сяргея Уладзіміравіча — спецыяліст у справе аптовага продажу харчавання. Якраз на былой вайсковай базе ёсць умовы для іх захоўвання. «Пабачым у перспектыве!» — усміхаецца прадпрымальнік.

Ці не пашкодзіць грандыёзным памкненням крызіс?

— Можа, нам і было трывожна, калі набывалі вайсковую часць, але мы не маглі прыйсці ў райвыканкам, дзе нам дапамагалі і разам з намі будавалі планы, і сказаць, што баімся альбо проста памянялі меркаванне, — прызнаецца Давыдаў. — Ведаеце, крызісы прыходзяць і сыходзяць. Мне цяпер падаецца, што колішні жнівеньскі дэфолт быў больш крутым за цяперашні крызіс. Ды і дзякуй Богу — жывём у Беларусі.

Вайсковая часць канчаткова стане прыватнай уласнасцю толькі праз 3 гады, калі прадпрымальнікі вытрымаюць усе ўмовы і бізнэс пойдзе. Прычым не толькі на карысць уладальнікам, але і раёну: маюцца на ўвазе новыя працоўныя месцы, заробкі людзям, падаткі ў бюджэт і інфраструктура для прыцягнення ў рэгіён кліентаў з грашыма.

У Барсуках гавораць, што галоўнае для бізнэсу — гэта не грошы, таму што ніхто іх не дасць дарма. І не сувязі, таму што цяпер можна за два дні афіцыйна стаць бізнэсменам, проста падаўшы заву. Але патрэбная добрая ідэя і, што яшчэ больш важна, жаданне працаваць.

— Я спакойна стаўлюся да ўласнасці і вялікага гонару ў валоданні чым-небудзь не бачу, — гаворыць Сяргей Давыдаў. — Толькі б справа ішла. Калі ты ўласнік, а нічога не працуе — усё лухта. Мне трэба, каб быў прыбытак, каб людзі працавалі і мелі варты заробак. Павага людзей даражэйшая за любую ўласнасць.

Ілона ІВАНОВА,

Клімавіцкі раён.

У КОЖНЫМ РАЁНЕ БЕЛАРУСІ З'ЯВІЦЦА ЎЛАСНАЯ ТУРЫСТЫЧНАЯ ПЛЯЦОЎКА

Напярэдадні шасцідзесяцігоддзя спартыўнага турызму, старшыня Рэспубліканскага турысцка-спартыўнага саюза Мікалай ДУБОВІК распавёў журналістам пра маленькія перамогі, вялікія праблемы і цікавыя напрацоўкі...

Горныя паходы па абрывістых сцежках, лясныя шпацыры, завілістыя сплавы па рэках і, безумоўна, лірычная песня ля вогнішча... Трыццаць гадоў таму падобная рамантыка ўспрымалася нашымі бацькамі як нязменная частка жыцця, а сёння...

— Сёння колькасць аматараў турыстычных злётаў і паходаў у параўнанні з часамі Саветаў скарацілася, — з сумам сцвярджае Мікалай Дубовік. — І тыя турысцкія клубы, у якіх мы праводзілі заняткі, знаходзяцца ў занядбаным стане. Ды і фінансаў для нармальнага развіцця дакладна не хапае. Добрую падтрымку нам аказвае толькі Міністэрства спорту і турызму.

Аднак, як лічыць старшыня РТСС, Беларусь, у адрозненне ад іншых рэспублік былога СССР, здолела захаваць «стройную сістэму» дзіцячага і школьнага турызму. Кожны год школьнікі бяруць удзел у лакальных турслётах і нават у міжнародных сустрэчах. Ёсць і перамогі. Але, каб нармальна вучыць моладзь турысцкім асновам, патрэбны кадры, якіх таксама хапае.

— У сферы спартыўнага турызму ў БДУФК вучыцца толькі сем будучых выпускнікоў, — падкрэслівае **Павел НЯПРАХІН, кіраўнік упраўлення фізічнай культуры Міністэрства спорту і турызму**. — Я лічу, што гэта маленькая лічба. Сёлета будзе першы выпуск і мы пабачым перспектыўнасць гэтай спецыяльнасці. Што да нашых планаў, то ўжо налета ў кожным раёне рэспублікі з'явіцца ўласная пляцоўка для турысцкіх патрэбаў, што, безумоўна, павінна паўплываць на папулярызацыю...

— Ведаеце, раней нам вельмі добра дапамагалі прафсаюзы. Уявіце, што Мінскі клуб мог забяспечыць намётамі дваццаць аўтобусаў, — на пытанне карэспандэнта «Звязды» адказвае **Валянціна МАКСІМЕНКА, намеснік старшыні Рэспубліканскага турысцка-спартыўнага саюза**. — Аднак пасля яны ад нас адмовіліся, ліквідавалі турыстычныя клубы і больш не падтрымліваюць фінансава саюз. Мы нават не ведаем, куды падзеўся ўвесь інвентар...

Нягледзячы на гэта, Мікалай Дубовік бачыць развіццё спартыўнага турызму ў адраджэнні спецыяльных клубаў, якія ў савецкі час былі папулярнымі сярод аматараў. На новыя саюзу не хапае сродкаў. Аднак амаль кожнае буйное айчыннае прадпрыемства мела свой, хоць і маленечкі, турысцкі цэнтр энтузіястаў, якія і сёння гатовыя прапагандаваць турызм. Таму нават пры такой колькасці надзённых пытанняў падобная перспектыва бачыцца рэальнай.

Тарас ШЧЫРЫ.

Еўраваяж

Калізей ніжэйшы за Нацыянальную бібліятэку!

Нашы карэспандэнты пабачылі ў Рыме 2000-гадовыя храмы і знайшлі падабенства беларускай і старадаўнярымскай архітэктуры

Славуты Калізей збудаваны ў 80 годзе нашай эры.

Спеў птушак у 500-гадовым лесе абуджае нас. Прачынаемся і шыбуем на пляж — Адрыятычнае мора ў верасні асабліва чароўнае. Аднак знаходзячыся ля Рыма, грэх доўга цешыцца морам...

Як вы думаеце, ці цяжка даехаць да Рыма? Анягож! Дзеля гэтага трэба сесці на бясплатны гатэльны аўтобус на ўзбярэжжы Адрыятычнага мора, даехаць за пару хвілін да станцыі «Хрыстафор Калумб» і за трыццаць хвілін даймчаць да станцыі метро «Піраміда». Дзве станцыі на метро — і перад вачыма...

— Палыч, трасца мне ў бок, гэта ж Калізей!.. — ажно аслупянеў ад відовішча карэспандэнт Валошын.

— Валошын, наступі мне на нагу, — як у сне сказаў карэспандэнт Лабадзенка. — Здаецца, мы перапілі віна і патрапілі ў падручнік па гісторыі!..

Калізей заўжды здаваўся нам нечым недасягальным. І нават не з-за тысяч кіламетраў, якія аддзяляюць Мінск і Рым. Цяжка асэнсаваць, гледзячы на гэту агромністую пабудову, што ўзнікла яна 2000 гадоў таму — і ўсяго за 5 гадоў!.. Без сучасных кранаў і тэхналогій!.. Выключна дзякуючы генію тагачасных рымлянаў і неабмежаванай працоўнай сіле рабоў. Дарэчы, Калізей на 20 метраў ніжэйшы за нашую Нацыянальную бібліятэку, але плошча ягоная візуальна здаецца большай.

Абыходзім Калізей два разы, фатаграфуем, паралельна шукаючы ўваход. Уваход каштуе 12 еўра, для моладзі 7,5. Аднак давесці свой узрост можна толькі з пашпартам — ніякім студэнцкім карткам яны не вераць. І да ўсяго — чарга стаіць гадзіны на дзве...

— У газетным шапіку цераз дарогу вы можаце прыдбаць Roma Pass — адзіны квіток ва ўсе музеі Рыма, — спагадліва падказвае мілая дзяўчына на ўваходзе. — Да таго ж, з гэтым квітком, прынамсі ў нас, уваход без чаргі.

Так і робім. Аднак гэты Roma Pass каштуе 23 еўра — таму бяром адзін на дваіх, вырашаючы хадзіць па чарзе. Да цуда-квітка, які выглядае як банкаўская пластыкавая картка, дадаецца квіток на ўсе віды транспарту на тры дні (шкада, што мы ўжо набылі за 16 еўра такі ж праязны на тыдзень), карта Рыма і гід па музеях.

— Ідзі, Палыч, любуйся тварэннем старадаўніх рымлян, а я пакуль на сучасных рымлянак палюбуюся, — кажа карэспандэнт Валошын.

Храм Іль-Джэзу — правобраз касцёла Божага Цела ў Нясвіжы.

Калізей, для свайго ўзросту, захаваўся адносна добра. Ён цалкам закансерваваны — усе гарызантальныя плоскасці залітыя спецыяльным рэчывам, якое не дае сценам разбурацца. Аднак трывога за помнік не пакідае рымскія ўлады — літаральна ўчора з'явілася навіна, што неўзабаве ўнікальны помнік закрыюць на рамонт — сцены будуць мазаць нейкім спецыяльным росчынам, дарогу адводзіць далей. Бо сапраўды — машыны ездзяць пад самымі сценамі помніка. Навукоўцы высветлілі, што такая сталая вібрацыя не ідзе яму на карысць і можа прывесці да фатальных наступстваў.

Сёння ўнутры Калізея — музей пад адкрытым небам. Зробленыя спецыяльныя мосцікі і сцежкі для турыстаў. У цэнтры, дзе была арэна для гладыятарскіх баёў, археолагі адкрылі шматлікія падземныя памяшканні — там утрымлівалі людзей і жывёлу. Добра, карэспандэнт Валошын чакае — трэба перадаваць яму квіток.

— Хрэн!.. — абурана кажа карэспандэнт Валошын, вяртаючыся праз хвіліну. — Сказалі «онлі ўан тайм», два разы ў адзін помнік нельга!.. От сабакі!..

Літаральна насупраць Калізея — «руіны і калоны», якія мы вырашаем агледзець.

— Добра, сюды я квіток набуду... — кажа Валошын і з болем у сэрцы аддае 12 еўра.

Рымскі Форум — колішняя плошча старадаўняга Рыма. Спачатку тут быў толькі кірмаш, затым узніклі пабудовы — каміцыі (месцы народных сходаў), курыя (Сенат), храмы.

Сёння Форум — таксама агромністы музей пад адкрытым небам. Уваход у яго знаходзіцца паблізу пагорка Палацін — месца, дзе ўзнік Рым. Паводле падання, менавіта тут ваўчыца выкарміла Ромула і Рэма. Тут захаваліся рэшткі палаца імператара Аўгуста, стадыён з «віп-ложай», шмат іншых пабудоў і руінаў. На тэрыторыі ўласна Форуму можна пабачыць руіны Храма Сатурна і Дыяскурсаў, якім 2500 гадоў, Храма Антаніна і Фаўстыны, якому 1900 гадоў, Храма Веспасіяна, якому 2000 гадоў, а таксама славутую Арку Ціта, якой 1900 гадоў.

— Цікава, а праз 2000 гадоў будуць гэтаксама аглядаць руіны нашага Палаца Рэспублікі?.. — задуменна пазіраў на калоны карэспандэнт Валошын. — Трэба якіх прыгожых калонаў кругом набудаваць...

Пачынае накрапваць дождж, усе хаваюцца пад дрэва. Побач з намі — дзве турысткі, яўна мама з дачкой.

— Муся, какой тебе дождь, иди фотографируй, такие деньги отдали!.. — загадвае мама дачцэ і надзявае на галаву пакет з крамы.

...Уздымаемся на Капіталійскі пагорак, што каля самага Форума. Тут, на вяршыні, стаіць Капіталійскі палац работы славутага Мікеланджэла Буанароці. Перад ім — конная статуя Марка Аўрэлія, якой таксама 2000 гадоў. Злева, на плошчы Сан Марка, агромністы палац Іль Вітарыяна, прысвечаны Віктору-Эмануілу II, пад кіраўніцтвам якога Італія зрабілася адзінай дзяржавай.

Калі стаць да палаца тварам, то злева зноўку будуць руіны — на гэты час Траянскага форума. Нас цікавіць храм Святой Марыі. На ўзор яго быў збудаваны касцёл у вёсцы Воўчын Камянецкага раёна, дзе нарадзіўся, а пасля быў пахаваны апошні кароль Рэчы Паспалітай Станіслаў Аўгуст Панятоўскі.

Троху далей, за плошчаю Сан-Марка і Палацца Венецыя, нас цікавіць яшчэ адзін «беларускі храм». Тут знаходзіцца Іль-Джэзу, саборны храм Ордэна Езуітаў, які на нашай зямлі даў асвету сотням беларусаў. Заснавальнік Ордэна Ігнат Лаёла пахаваны тут жа. Але найбольшы шарм Іль-Джэзу — што менавіта на ягоны ўзор славуты архітэктар Джавані Марыя Бернардоні стварыў нясвіжскі касцёл Божага Цела. Іль-Джэзу збудаваны ў 1584-м — і, хоць гэта не цалкам барочны храм, менавіта ён паклаў пачатак велічнаму стылю барока. А ўсяго праз тры гады ў Нясвіжы пачынае будавацца касцёл Божага Цела, які стаў першым барочным храмам на тэрыторыі Усходняй Еўропы. Як бачым, беларускае грамадства ў асобе Мікалая Крыштафа Радзівіла Сіроткі ні на грам не адставала ад тагачасных прасунутых рымлянаў!

— Палыч, ужо ногі стаптаў, есці хачу, рымлянаў сапраўдных пабачыць, мафіёзі якога, — пачаў скуголіць ад перанасычэння архітэктурнымі каштоўнасцямі карэспандэнт Валошын. — Хадзем!

— І праўда, Парыж пабачылі і не памерлі, дык памерці з голаду ў Вечным Горадзе не хацелася б!.. — паэтычна загаварыў карэспандэнт Лабадзенка. — Будзем вячэраць на беразе легендарнага Тыбра, як імператары!..

Мы скіраваліся да бліжэйшага супермаркета, скінуліся па пару еўра і скалацілі «імператарскі» стол: некалькі пакецікаў чырвонага віна (1,5 еўра), нарэзанай каўбасы з аліўкамі на манер нашай «Доктарскай» (0,8 еўра), вялізны пачак салаты на дваіх (1,8 еўра), які заправілі маянэзам з цюбіка (0,9 еўра). Усё гэта мы склалі ў торбу і пайшлі праз дарогу да каменных берагоў славутай ракі.

— Галоўнае, каб нас адсюль мясцовыя бамжы не пагналі, — выказаў пажаданне карэспандэнт Лабадзенка.

Але ніякіх бамжоў на беразе не было. Мы спусціліся па прыступках да самай вады і расклалі ўсё наша дабро.

Сядзець на беразе ракі, пра якую раней чуў выключна з падручніка па гісторыі — шляхетная асалода. Мы паціваліся добрае віно, разважалі пра вечнасць і паласкалі ногі ў Тыбры. Так працягвалася мо паўгадзіны, пакуль на нас не ўпалі першыя кроплі дажджу...

Глеб ЛАБАДЗЕНКА, Яўген ВАЛОШЫН.
Фота аўтараў.

Рым.

(Працяг будзе.)

Кепка «Звязды» на галаве карэспандэнта Лабадзенкі дабралася да Адрыятычнага мора.

СЁННЯ
ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА

Споведзь «пералётнай птушкі»

(Заканчэнне.
Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)

Аднойчы, проста шуткуючы, сяброўка прапанавала ёй паехаць у Амерыку. На гэты жарт Насця адказала станоўча, ды яшчэ і матулі паспела сказаць аб такім намеры. І на сваё здзіўленне атрымала згоду. Вось так і вырашыўся лёс адпачынку падчас летніх канікулаў. Вядома ж, было страшнавата, паколькі такая паездка ў жыцці Насці намячалася першы раз, ды яшчэ і не бясплатная. А тлуму колькі, дык пра гэта Насці наогул успамінаць не надта хочацца. Трэба было і з агенцтвам вызначыцца, паколькі паездка афармлялася праз студэнцкую праграму, якая прадугледжвае разнастайныя выгады: гэта і дапамога з пошукамі жылля і працы, і хуткае афармленне дакументацыі (копія пашпарта, студэнцкага білета, даведка з універсітэта, анкеты, якія трэба тэрмінова запоўніць), і атрыманне візы, і адпаведны кошт.

— *Давялося падцягнуць сваю англійскую мову, пахадзіць на курсы. Не без гэтага, — з усмешкай кажа Насця.*

Праводзіць «пералётную птушку» выйшла амаль што ўсё сямейства. Ды і не дзіва, шлях няблізкі, а са знаёмых толькі юнак, з якім Насці пашчасціла пазнаёміцца ў аэрапорце падчас пасадкі. На жаль, яго шлях ляжаў да Нью-Ёрка, а маёй сяброўцы трэба было яшчэ вытрываць 18 гадзін у аўтобусе да Паўднёвай Караліны.

— *Некаторыя баяцца пералётаў, трасуцца перад пасадкай. Асабіста мне вельмі спадабалася ляцець самалётам. Страху не было, большую частку маёй свядомасці займала цікаўнасць. Дзесьці гадзіну з паловай я прасядзела ля ілюмінатара, — успамінае Насця — Ніколі не забудуся на тую прыгажосць, якая адкрылася перада мною, калі я спусцілася па трапе самалёта. Вялікі, магутны ў сваёй прыгажосці Нью-Ёрк раскінуўся перад маімі вачыма.*

Адчування таго, што апынулася далёка ад радзімы, у Насці не было. Можа, таму, што жыць яна засялілася з такімі ж студэнтамі-падарожнікамі, як і сама, ды яшчэ і з Расіі. Праўда, першы тыдзень Насця маўчала, паколькі, ці то ад страху, ці то ад пераадаптацыі, словы проста вылецелі з галавы. Яна саромелася свайго вымаўлення, якое, напэўна ж, адрознівалася ад вымаўлення карэнных амерыканцаў, якія не заўсёды размаўляюць толькі па нормах.

— *Амерыканцы надта добрыя людзі. Яны ніколі не дазволяць табе застацца сам-насам са сваёй бядой. Спытаешся дарогу — не толькі падкажуць, пакажуць, але яшчэ і грошай на метро дадуць. Праўда, думаюць яны перш за ўсё страўнікам. Мабыць, таму і аддаюць перавагу думкам аб «снікерсах», хот-догах і падобнаму. Ход мыслення ў іх трохі іншы ў параўнанні з нашым.*

Першае сваё працоўнае лета ў Амерыцы Насця аддала курортнаму гарадку, дзе ёй давялося сумяшчаць адразу два месцы, таму расклад у яе быў даволі шчыльны, ледзь-ледзь знаходзіўся час на сон і экскурсіі ў Нью-Ёрк і Вашынгтон. Хацелася зарабіць больш грошай, хоць перш за ўсё ехала яна туды па вопыт, па самастойнасць.

— *Там я была адна, далёка ад усіх родных і магла самастойна вырашаць усе свае праблемы, — кажа Насця. — Раю ўсім рабіць такія паездкі, і для самастойнасці, і для заробку, і для таго, каб паглядзець свет.*

Другім сваім працоўным летам Насця паехала адразу ў Нью-Ёрк, дзе больш ветліва прымаюць рускіх студэнтаў, паколькі яны прыязджаюць туды дзесьці ў маі, у той час, як студэнты з Беларусі прыбываюць у сярэдзіне чэрвеня, калі не ў ліпені. Таму ім і цяжэй знайсці працу. Ды і сітуацыя з пошукамі жылля складваецца не лепшым чынам.

Большасць з іх не ведае наогул нічога пра нашу краіну. З маіх знаёмых, якіх я паспела завесці падчас свайго знаходжання там, толькі адзін ведаў нашу краіну і тое толькі таму, што ў яго быў трактар «Беларус». Ды што казаць, калі некаторыя нават і пра Расію нічога не ведаюць. Мая сяброўка аднойчы зайшла ў краму і папрасіла тэлефонную картку на расійскі рэгіён. Прадаўшчыца шчыра здзівілася і спыталася, ці гэта часам не ў Мексіцы?

— *Я на свае вочы бачыла, як мае знаёмыя ганяюць клапоў па пакоі. Яны з імі ўжо зжыліся, — успамінае Насця, — а для мяне дык гэта быў жах.*

Але, нягледзячы на ўсе праблемы, пры вялікім жаданні з Амерыкі можна прывезці немалыя заробкі. Сродкі, укладзеныя ў праграму, акупяцца не адзін раз.

— *Калі эканоміць, — усміхаецца Насця. — Там столькі прыемных і не надта карысных дробязяў, на якія так і хочацца спусціць усе зароблены грошы. А насамрэч і без іх можна абысціся. Удадатак яшчэ гэтыя падарожжы, якія так і прывабліваюць сваёй разнастайнасцю і цікавым зместам. Напрыклад, знаменіты Лас-Вегас ці Дыснэй Лэнд. Проста сорам быць у Амерыцы і не наведаць гэтыя знакамітыя месцы.*

А яшчэ адзенне, якое так і вабіць дзяўчат з вітрын розных крамаў. Напрыклад, Насця ў гэтым годзе туды ехала з адной сумкай, а вярнулася з трыма. Адну з іх ёй давялося ўзяць з сабой у самалёт, у багаж яе не прынялі.

Пасля прыезду дадому Насці цяжка было адаптавацца да надвор'я: там духата, прычым заўсёды, нават тады, калі лье дождж, а тут, здаецца, і сонейка, але падзьме ветрык — і становіцца халаднавата. Не дзіва, што ёй давялося пралежаць некалькі дзён дома з прастудай.

Нягледзячы на ўсе прыемныя моманты, якія Насця перажыла ў Амерыцы, застацца жыць там назаўсёды ёй не хочацца.

— *Мабыць, таму, што я ўсё ж такі беларуска і мой менталітэт нельга змяніць. Наш тып мыслення адрозніваецца ад тыпу мыслення амерыканца. Там мужчыны настолькі адкрыта праяўляюць сваю сімпатыю да дзяўчат, што часам гэта нават здзіўляе, пужае. Ім вельмі падабаюцца нашы жанчыны, наш славянскі тып, паколькі жанчын, насамрэч прыгожых, там мала. Разам з тым, большасць з іх не ведае наогул нічога пра нашу краіну. З маіх знаёмых, якіх я паспела завесці падчас свайго знаходжання там, толькі адзін ведаў нашу краіну і тое толькі таму, што ў яго быў трактар «Беларус». Ды што казаць, калі некаторыя нават і пра Расію нічога не ведаюць. Мая сяброўка аднойчы зайшла ў краму і папрасіла тэлефонную картку на расійскі рэгіён. Прадаўшчыца шчыра здзівілася і спыталася, ці гэта часам не ў Мексіцы?*

У цэлым Насця задаволена тым, як яна правяла лета. Ёй удалося сумясціць адразу некалькі момантаў: і грошы зарабіла, і адпачыла, і свет паглядзела, і новых сяброў знайшла, што ўжо многае на гэтым этапе яе жыцця. Галоўнае, што яна наогул рашылася на такі важны крок і зрабіла яго смела, без аглядкі, прычым ступаць ёй давялося па гэтай сцяжынцы не аднойчы, а зноў і зноў. Бясспрэчна, і ў нашай краіне можна знайсці шмат выгод, але іншыя кантыненты карысныя менавіта тым, што даюць смеласць і вольнасць, а разам з імі і вялікую самастойнасць. Трэба толькі паверыць і знайсці сілы раскінуць крылы для шырокага палёту. Менавіта так, як гэта ўдалося зрабіць Насці.

Шырыню палёту вымярала студэнтка БДПУ імя Максіма Танка Наталля БЕЛЬЧАНКА.

МОЛАДЗЬ УШАНУЮЦЬ ЗА ПОСПЕХІ Ў ПРАЦЫ

На сёлетніх «Дажынках» сярод удзельнікаў фестывалю-кірмашу працаўнікоў вёскі будуць ушаноўваць і пераможцаў рэспубліканскага спаборніцтва сярод моладзевых уборачных экіпажаў па ўборцы збожжа і зернебабовых культур і кіроўцаў, якія былі занятыя на адвозцы збожжа, членаў БРСМ.

Як паведамілі нашаму карэспандэнту ў Брэсцкай абласной арганізацыі БРСМ, у гэтыя дні актывісты Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі арганізуюць працу моладзевай пляцоўкі на вуліцы Гастэла, дзе галоўнай падзеяй святочнага мерапрыемства (18 верасня ў 16.30) стане ўзнагароджанне маладых механізатараў і кіроўцаў нагрудным знакам БРСМ «За поспехі ў працы».

Трэба зазначыць, што прадстаўнікі моладзевага саюза зрабілі свой унёсак у сёлетні рэспубліканскі каравай: ва ўборачнай кампаніі ўзялі ўдзел больш за 950 моладзевых уборачных экіпажаў і 900 маладых кіроўцаў, якія былі занятыя на адвозцы збожжа.

Ігар ГРЫШЫН.

Юрый КРЫВАДУБСКІ:

«Фестываль «Моладзь — за Саюзную дзяржаву» — першая прыступка да сяброўства моладзі Беларусі і Расіі»

Моладзь Беларусі і Расіі па традыцыі збярэ сёлета IV фестываль «Моладзь — за Саюзную дзяржаву». Трэці год запар форум пройдзе ў расійскім Растове-на-Доне з 22 па 28 верасня. Для ўдзельнікаў фэсту падрыхтавана насычаная і займальная праграма: творчыя вечары, канцэрты, сустрэчы з вядомымі спартсменамі і дзеячамі культуры, выстава-прэзентацыя грамадскіх моладзевых аб'яднанняў Беларусі і Расіі. Адной з цэнтральных падзей стане міжнародны конкурс выканаўцаў моладзевай песні. Як чакаецца, разам з канкурсантамі на фестывальную сцэну выйдуць папулярныя выканаўцы Ірына Дарафеева, Гюнеш, Варвара, гурт «Чараўнікі двара», а таксама пераможцы гэтага конкурсу мінулых гадоў — Віталь Гардзей, Яна Курыленка, Аляксандр Ялоўскіх. А пра ўсе падрабязнасці мы папрасілі расказаць першага сакратара ЦК БРСМ Юрыя Крывадубскага.

— Чым будзе адметны IV-ы фестываль «Моладзь — за Саюзную дзяржаву»?

— Сёлета, як і ў мінулыя два гады, фестываль «Моладзь — за Саюзную дзяржаву» будзе прымаць Растоў-на-Доне. Адзін з асноўных складнікаў фэсту — песенны конкурс, узровень якога ўзрастае з кожным годам. Напрыклад, летась пераможцам конкурсу стаў Віталь Гардзей, які потым перамог на «Славянскім базары». І сёлета, думаю, нашы юнакі і дзяўчаты пакажуць высокія вынікі, і беларускія выканаўцы зоймуць дастойныя месцы. Самы актыўны ўдзел у форуме прымуць дэпутаты Парламенцкага сходу, дзяржаўныя, грамадскія і палітычныя дзеячы.

У рамках фэсту пройдзе прэс-канферэнцыя саюзных парламентарыяў, да форуму прымеркавана і правядзенне пасяджэнняў камісій Парламенцкага сходу па інфармацыйнай палітыцы, па сацыяльнай палітыцы, навуцы, культуры і гуманітарных пытаннях, а таксама па заканадаўстве і рэгламенце, у якіх возьмуць удзел і нашы прадстаўнікі. Мы плануем выступіць з ініцыятывамі, якія датычацца і студатрадаўскага, валанцёрскага руху. Набліжаецца 65-годдзе Вялікай Перамогі. Усе гэтыя важныя напрамкі ініцыюем. У праграме фэсту — сустрэча алімпійскіх чэмпіёнаў з моладдзю. Будуць прадстаўнікі і расійскага, і беларускага боку. Плануецца таксама ўдзел пераможцаў і прызёраў дзіцячага «Еўрабачання». Вы ведаеце, што Беларусь мае багатыя традыцыі перамог, і Расія таксама. Акрамя таго, пройдуць канцэрты ў гарадах Растоўскай вобласці, дзе выступяць і ўдзельнікі фестывалю «Моладзь — за Саюзную дзяржаву», і вядомыя выканаўцы дзвюх краін.

— Як выбіралі ўдзельнікаў фестывалю?

— Асноўная мэта фестывалю — даць маладым выканаўцам і маладым калектывам сябе праявіць, каб іх заўважылі, і надалей іх творчая кар'ера развівалася. Мы праводзілі спецыяльны адбор выканаўцаў з усіх рэгіёнаў Беларусі і Расіі. Выбралі самых годных, хто мае вялікі багаты творчы патэнцыял. Будуць прадстаўлены ўсе рэгіёны Беларусі: адабраныя выканаўцы і маладыя людзі з цікавымі праектамі. Гэта будзе ў Данскім тэхнічным універсітэце, дзе маладыя людзі змогуць паказаць свае напрацоўкі.

— Насамрэч праекты маладых заслугоўваюць увагі?

— Безумоўна, бо праз канкрэтную працу, цікавыя праекты моладзь набірае вопыт, рэалізуе сябе. А гэта вельмі важна, таму што будучыню краіны будаваць маладым. Гэта выдатны лозунг, і задача нашай арганізацыі ўвасабляць яго ў жыццё.

— А якія праекты мінулага года вы можаце прыгадаць?

— Летась адной з асноўных тэмаў фестывалю было развіццё моладзевага прадпрымальніцтва. І, дарэчы, наша арганізацыя гэтаму пытанню надае асаблівую ўвагу. Мы сумесна з цэнтрам сістэмных даследаванняў праблем моладзі БДУ вядзём работу па прыцягненні здольных маладых людзей да прадпрымальніцтва. Бо, не сакрэт, стаць прадпрымальнікам можа не кожны. Для гэтага неабходны пэўныя веды, канкрэтныя ідэі. Наша асноўная ідэя — даць старшакласнікам базавыя веды, навыкі, каб яны навучыліся рыхтаваць праекты і іх рэалізоўваць спачатку ў сваім рэгіёне. Бо прадпрымальніцтва пачынаецца з малога. Малы і сярэдні бізнэс маюць вялікія перспектывы. Цяпер у краіне на дзяржаўным узроўні надаецца вялікая ўвага развіццю менавіта гэтага сектара эканомікі.

— Сёлета вы другі раз паедзеце ў Растоў-на-Дону на фестываль «Моладзь — за Саюзную дзяржаву». Чым вам запомніўся мінулы?

— Фестываль запомніўся добрай атмасферай, узаемапаразумення. Галоўная ідэя, што ў маладых ёсць магчымасць сустрэцца, абмяняцца думкамі, ідэямі, завязаць новыя кантакты. Гэты фестываль — першая прыступка да сяброўства моладзі Беларусі і Расіі. Чым больш такіх кантактаў, тым больш цікавых сумесных праектаў.

— Цікава, а ці разглядаецца магчымасць правядзення фестывалю ў нашай краіне?

— Не будзем выключаць такой магчымасці. У нас вельмі шмат прыкладаў рэгіянальнага супрацоўніцтва, заснаваных на тым, што многія беларускія гарады маюць гарады-пабрацімы ў Расіі. І я лічу, што менавіта рэгіянальнае супрацоўніцтва на ўзроўні гарадоў, раёнаў, абласцей — вельмі цікавае і канструктыўнае. Вельмі плённа Мінская вобласць кантактуе з Маскоўскай. Гэта сяброўства доўжыцца з савецкіх часоў. Практычна ўсе гарады Мінскай вобласці маюць гарады-пабрацімы ў Маскоўскай вобласці. Добрыя кантакты ў Гомельскай вобласці з Бранскай, Чарнігаўскай абласцямі. І міжнародны моладзевы лагер славян «Дружба» на мяжы Беларусі, Расіі і Украіны, які сёлета адзначыў 40 гадоў, — прыклад традыцый, якія ідуць яшчэ з савецкага перыяду.

— Чаго менавіта вы чакаеце ад IV-га фестывалю «Моладзь — за Саюзную дзяржаву»?

— Я, перш за ўсё, чакаю новых ідэй, кантактаў, новых праектаў, менавіта сумесных, беларуска-расійскіх, моладзевых. Нагадаю, у 2014 годзе ў Расіі будуць праходзіць зімовыя Алімпійскія гульні, і ў нас ёсць прапановы. Мы спадзяёмся на падтрымку Парламенцкага Сходу на ўдзеле беларускай моладзі ў падрыхтоўцы да Алімпійскіх гульняў.

Як адзначаюць арганізатары, асноўная мэта фэсту — стварэнне адзінай культурнай прасторы на тэрыторыі Саюзнай дзяржавы, умацаванне сяброўства і паразумення моладзі Расіі і Беларусі, захаванне і развіццё лепшых традыцый у галіне культуры і мастацтва, выяўленне новых таленавітых творчых калектываў і выканаўцаў. Арганізатары маюць намер дапамагчы маладым грамадзянам дзвюх краін адчуць сябе паўнапраўнымі ўдзельнікамі палітычнага і грамадскага жыцця і актыўна ўключыцца ў працэс будаўніцтва Саюзнай дзяржавы. Фестываль павінен паказаць не толькі нарастаючую ролю маладога пакалення ва ўсіх сферах жыцця сучаснага грамадства, але і навучыць упэўнена дэманстраваць сваю грамадзянскую пазіцыю.

Святлана СУХАРКО.

Ёсць пытанне

ЦІ АБАРОНЕНЫЯ МАЛАДЫЯ СПЕЦЫЯЛІСТЫ АД СКАРАЧЭННЯ?

Месяц таму шчаслівыя ўладальнікі дыпломаў аб заканчэнні ВНУ прыступілі да працы. Аднак пытанні ў маладых спецыялістаў застаюцца. Па кампетэнтны каментар мы звярнуліся да ***намесніка старшыні Цэнтральнага камітэта Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі Рамана ДАПІРЫ****.*

■ Малады спецыяліст пасля года адпрацоўкі па размеркаванні пажадае паступіць у магістратуру на дзённае аддзяленне, ці давядзецца яму вяртаць дзяржаве сродкі, выдаткаваныя на яго навучанне?

Ці можа выпускнік, які быў размеркаваны, паступіць у магістратуру ВНУ замежнай краіны?

У Законе Рэспублікі Беларусь «Аб вышэйшай адукацыі» запісана, што асобы, якія не адпрацавалі тэрмін працы па размеркаванні ў сувязі з паступленнем у год атрымання дакумента аб вышэйшай адукацыі ў магістратуру, аспірантуру (ад'юнктуру) на дзённую форму атрымання адукацыі і закончылі навучанне ў вызначаным парадку, вызваляюцца ад вяртання выдаткаваных на іх падрыхтоўку грошай (пункт 5 артыкула 30).

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Аднак ні ў Законе «Аб вышэйшай адукацыі», ні ў Палажэнні аб вяртанні сродкаў нічога не сказана ні пра тое, у якой краіне павінна знаходзіцца магістратура, ні пра тое, у ВНУ якой формы ўласнасці (дзяржаўнай ці недзяржаўнай). Здараецца, што маладым людзям кажуць у ВНУ, што яны могуць паступаць у магістратуру замежнай ВНУ толькі ў тым выпадку, калі магістрантаў адпаведных спецыяльнасцяў не рыхтуюць у Беларусі. Гэта, заўважу, адвольная трактоўка, якая ўскладняе жыццё маладым спецыялістам. Мы трактуем сітуацыю наступным чынам: калі ў даведцы, выдадзенай ВНУ іншай краіны, будзе запісана, што малады чалавек навучаўся там па адпаведнай спецыяльнасці на дзённай форме навучання, значыць, ён павінен быць вызвалены ад вяртання дзяржаве сродкаў. Іншая сітуацыя, калі, і даволі часта, нашы выпускнікі паступаюць у ВНУ іншых краін і залічваюцца там на постдыпломную адукацыю. Гэта не магістарская падрыхтоўка, і званне магістра яны не атрымліваюць. Прабачце, гэта ўжо зусім іншая рэч...

Хачу паведаміць, што сёння ў беларускім Парламенце вядзецца работа над Кодэксам аб адукацыі. Мяркуецца, што ў Кодэксе будзе занатаваны тэрмін адпрацоўкі маладых спецыялістаў па размеркаванні і пасля атрымання адукацыі на першай ступені вышэйшай школы, і пасля навучання на другой ступені вышэйшай адукацыі. У праекце Кодэкса прадугледжаны наступны парадак: калі малады спецыяліст адпрацаваў два гады пасля навучання на першай ступені, то пасля заканчэння магістратуры ён павінен будзе адпрацаваць яшчэ адзін год. Мы будзем настойваць на крыху іншай трактоўцы. На наш погляд, павінна з'явіцца паняцце сумарнага тэрміну адпрацоўкі, паколькі на гэты момант магістратура разглядаецца як першая прыступка перад паступленнем у аспірантуру. Уявіце сабе, што будзе, калі малады чалавек два гады будзе працаваць па размеркаванні пасля навучання на першай ступені вышэйшай школы плюс адзін год пасля заканчэння магістратуры і 3 гады — па кантракце аб падрыхтоўцы аспіранта. У нас у апошнія гады назіраюцца сур'ёзныя праблемы з конкурсам у аспірантуру — звязваць сябе абавязацельствамі па такой працэдуры адпрацоўцы многія лічаць празмерным. Незразумела, чаму выключэнне збіраюцца зрабіць толькі для тых выпускнікоў, якія будуць паступаць у магістратуру толькі ў год заканчэння ВНУ па першай ступені. Практычны вопыт павінен, на мой погляд, заахвочвацца.

■ Студэнтка, якая навучалася па мэтавым накіраванні, сабралася ўзяць шлюб з замежным грамадзянінам і паехаць з мужам за межы Беларусі. Ці могуць прымусіць яе бацькоў вярнуць ВНУ сродкі за навучанне дачкі? І ці можна ўвогуле ў гэтым выпадку «адкупіцца», каб не губляць два гады?

Бацькі не могуць несці адказнасць перад ВНУ за дзеянні сваёй дачкі і не могуць выступаць адказчыкамі ў судзе па адпаведным іску. Аднак, калі малады спецыяліст не плануе выконваць узятыя на сябе абавязацельствы, яму давядзецца вярнуць дзяржаве сродкі, якія былі выдаткаваныя на яго падрыхтоўку. Для гэтага ёсць адпаведны механізм, прапісаны ў «Палажэнні аб вяртанні сродкаў у рэспубліканскі і (ці) мясцовыя бюджэты, выдаткаваных дзяржавай на падрыхтоўку рабочага (служачага), спецыяліста». Дзяўчыне трэба звярнуцца ў ВНУ, якая выдала ёй накіраванне на працу, у камісію па размеркаванні. І нават калі яна пакіне межы Беларусі, у яе могуць узнікнуць праблемы ў той час, калі яна раней ці пазней пажадае трапіць на тэрыторыю Беларусі. ВНУ абавязкова звернецца ў суд, каб спагнаць са сваёй выпускніцы грашовыя сродкі, і суд будзе вырашаць, як яе знайсці і прыцягнуць да адказнасці. Таму я параіў бы не даводзіць справу да суда і добраахвотна вярнуць дзяржаве сродкі за ўсе гады навучання. Я ўпэўнены, што ўсе выпускнікі бюджэтных аддзяленняў ВНУ павінны быць у роўных умовах: і тыя, хто застаўся працаваць на радзіме, і тыя, у якіх сямейныя абставіны склаліся так, што ім трэба паехаць за межы Беларусі. Тым больш размова ідзе пра ўладальніцу мэтавага накіравання, якая карысталася пэўнымі прывілеямі пры паступленні. Яна адразу брала на сябе абавязак адпрацаваць на тую арганізацыю, якая выдала ёй мэтавае накіраванне.

■ Малады спецыяліст другі год працуе ў арганізацыі, дзе плануецца правесці скарачэнне штату. Ці абаронены ён ад скарачэння? І якія дзеянні трэба ажыццявіць, калі ўсё ж такі трапіш пад скарачэнне: можна шукаць сабе працу самастойна ці трэба зноў звяртацца ў ВНУ?

Раней такіх пытанняў, як правіла, не ўзнікала, і маладых спецыялістаў ні пры якіх абставінах не чапалі на іх першым працоўным месцы два гады. Аднак эканамічная сітуацыя змянілася, і ў гэтым годзе ў прафсаюз пачалі паступаць такія запыты. Прычым не толькі з боку маладых спецыялістаў, але і ад наймальнікаў.

Згодна з артыкулам 42 Працоўнага кодэкса Рэспублікі Беларусь і Палажэннем аб размеркаванні, у наймальніка і сапраўды ёсць права звольніць маладога спецыяліста ў сувязі са скарачэннем штату. Наймальнікам мы раім паступаць наступным чынам. Ёсць працэдура папярэджвання работніка аб звальненні ў сувязі са скарачэннем штату. У той самы час, калі наймальнік папярэджвае свайго работніка пра планаванае скарачэнне, яму мэтазгодна праінфармаваць аб гэтым і ўстанову адукацыі, якая выдала свайму выпускніку накіраванне на першае працоўнае месца, каб там маглі падабраць для яго новы варыянт працаўладкавання. Ніякіх самастойных захадаў па пошуку працы малады спецыяліст не мае права рабіць. На працягу трох дзён з даты свайго звальнення ён (як і яго наймальнік) абавязаны паведаміць у ВНУ пра гэты факт. Калі ў камісіі па размеркаванні ВНУ на момант звароту маладога чалавека, які трапіў пад скарачэнне, не будзе ніякіх заявак на маладых спецыялістаў, у гэтым выпадку той атрымае даведку аб свабодным працаўладкаванні. Магчыма, хтосьці ўспрыме гэта як сваё вызваленне, але, упэўнены, што не ўсе, паколькі ёсць малазапатрабаваныя спецыяльнасці, па якіх працаўладкавацца праблематычна...

■ Дзяўчына ў 2008 годзе закончыла навучанне ў Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь. Была размеркаваная ў адну з мінскіх бальніц. Яна з'яўляецца круглай сіратой. Мае жыллё ў сельскай мясцовасці, непрыдатнае для пражывання. У Мінску ёй далі ложак у інтэрнаце. Калі дзяўчына звярнулася ў Адміністрацыю Кастрычніцкага раёна сталіцы, каб стаць у чаргу на паляпшэнне жыллёвых умоў, яе паставілі ў агульную чаргу. Ці ёсць у яе нейкія прывілеі як у маладога спецыяліста і як у круглай сіраты пры пастаноўцы на чаргу на працы, а таксама ў «жыллёвым аддзеле» раённай Адміністрацыі?

На гэты момант прывілеі прадугледжаны толькі для маладых спецыялістаў, якія з'яўляюцца лаўрэатамі спецыяльных фондаў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай і адоранай моладзі. У гэтым выпадку, наколькі я разумею, такіх прывілей у чытачкі «Звязды» няма. Калі ўзяць яе сацыяльны статус, то тут трэба глядзець на тое, наколькі непрыдатнае для пражывання жыллё, якое пакінулі за сіратой. І калі яно і сапраўды непрыдатнае, то павінна быць адпаведнае заключэнне выканкама па месцы знаходжання гэтага жылля. Калі заключэнне будзе ў дзяўчыны на руках, то яна зможа прэтэндаваць у Мінску на выдзяленне ёй сацыяльнага жылля. На жаль, са зместу той інфармацыі, якую заяўніца паведаміла ў рэдакцыю, не вынікае пэўных акалічнасцяў, каб можна было даць больш разгорнутую кансультацыю. Таму я параіў бы ёй звярнуцца ў юрыдычную кансультацыю Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі, дзе ёсць адпаведныя спецыялісты па жыллёвым праве (203 82 94).

■ Ці можа малады спецыяліст перараз мяркавацца, калі працаўваў не забяспечыў яго жыллём і адмаўляецца кампенсаваць выдаткі па найме жылля. І ўвогуле, якія могуць быць падставы для перараз мяркавання?

Сутнасць у тым, што ў Палажэнні аб размеркаванні выпускнікоў устаноў адукацыі, якія атрымалі прафесійна-тэхнічную, сярэднюю спецыяльную ці вышэйшую адукацыю, не прапісаны абавязак наймальніка забяспечваць маладога спецыяліста жыллём. Маладым спецыялістам, якія прыбылі на працу па размеркаванні, мясцовыя выканаўчыя і распарадчыя органы, а таксама арганізацыі, якія запрасілі на працу маладога спецыяліста, пры недастатковасці ўласнага жыллёвага фонду могуць, але не абавязаны, выдзяляць сродкі з мэтай кампенсацыі выдаткаў па найме жылля. Згодна з Палажэннем аб размеркаванні, права на перараз мяркаванне маюць усе катэгорыі, якія карыстаюцца прэферэнцыямі пры размеркаванні: гэта інваліды, маладыя людзі, якія маюць хворых бацькоў-інвалідаў ці мужа (жонку) інваліда I і II групы, сямейныя людзі, якія выхоўваюць дзяцей ва ўзросце да трох гадоў, цяжарныя жанчыны і г.д., калі гэтыя абставіны з'явіліся ўжо пасля размеркавання. Падставай для перараз мяркавання можа стаць таксама адмова наймальніка ў прыёме на працу маладому спецыялісту, накіраванаму ў адпаведнасці з заяўкай гэтага наймальніка, а таксама немагчымасць забяспечыць месцам працы ў адпаведнасці з атрыманай спецыяльнасцю і прысвоенай кваліфікацыяй пасля завяршэння службы ў войску. Напрыклад, малады спецыяліст быў прызваны ў войска яшчэ да таго, як паспеў прыступіць да працы паводле размеркавання. Або пасля службы ва Узброеных Сілах хоча прадоўжыць працаваць па месцы свайго размеркавання, а яго там не могуць забяспечыць працоўным месцам у адпаведнасці з атрыманай спецыяльнасцю і кваліфікацыяй. Ён таксама мае права на перараз мяркаванне. Да таго ж маладыя спецыялісты могуць звярнуцца ў камісію па размеркаванні з просьбай аб перараз мяркаванні, калі наймальнік пастаянна затрымлівае ім выплату заработнай платы. Згодна з Палажэннем, парушэнні наймальнікам працоўнага заканадаўства, калектыўнага ці працоўнага дагавора з'яўляюцца падставай для скасавання па патрабаванні работніка працоўнага дагавора і наступнага перараз мяркавання. Прычынай для перараз мяркавання можа быць таксама і хвароба, якая з'яўляецца супрацьпаказаннем да работы па атрыманай прафесіі ці не дазваляе працаваць у прапанаваных умовах.

Да таго ж у Палажэнні ёсць пункт, у якім агаворваецца магчымасць пераводу маладога спецыяліста з яго згоды ад аднаго наймальніка да іншага. Заўважу толькі, што наймальнік зусім не абавязаны адпускаць маладога спецыяліста, як і камісія не абавязана яго перараз мяркоўваць. Гэта іх права, а не абавязак. Але маладыя спецыялісты могуць прымаць меры, якія будуць спрыяць іх больш рацыянальнаму працаўладкаванню. Галоўнае — пераканаць у гэтым свайго наймальніка і камісію па размеркаванні.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Выпрабавана на сабе

ЯК Я ЗАРАБІЎ НА АЎКЦЫЁНЕ

«А зараз вашай увазе прапануецца ўнікальная ваза XVI стагоддзя! Пачатковы кошт — 150 тысяч долараў. Хто дасць больш?.. Спадарыня ў чырвоным — 160; Пан з кіем — 171; Спадарыня ў чырвоным не здаецца — 200. Дзвесце раз... дзвесце два... дзвесце тры — прададзена! Набытае па бліц-кошце!» — так я сабе ўяўляў аўкцыёны да таго часу, пакуль самому не давялося паўдзельнічаць...

Правілы гульні

Некалі мой брат вырашыў, што ягонаму, на мой погляд, зусім сапраўднаму камп'ютару, час сыходзіць у нябыт. Дзеля гэтага зусім не абавязкова было замяняць усе яго складальнікі, кшталту, манітора альбо клавіятуры — дастаткова для большай вытворчасці набыць толькі тры элементы: працэсар, відэакартку і аператыўную памяць. У дадатак давялося купляць яшчэ і блок сілкавання. Калі ж усё неабходнае было набыта і заняло сваё месца ў «жалезнай» архітэктуры, на парадку дня з'явілася новае пытанне: што рабіць са старым, яшчэ досыць працоўным абсталяваннем? Адказ быў адзін: трэба прадаваць! І прадаць не проста абы-як, але так, каб за хуткі час забяспечыць сабе максімальны (ці хоць бы не ніжэй за разумную рысу) выйгрыш. Менавіта таму і з'явілася ідэя выставіць у якасці лотаў старыя камплектавыя часткі на які-небудзь аўкцыён.

Сёння існуе шмат аўкцыёнаў, на якіх нават звычайны недасведчаны чалавек можа выставіць нейкую прадукцыю на продаж. Большасць гэтых сэрвісаў месяцамі ў інтэрнэце, каб звесці на нуль усе выдаткі, звязаныя з арэндай памяшкання ды абслугоўваннем персаналам, які ў сеціве ўвогуле не патрэбны. Варта заўважыць, што кожны аўкцыён мае свае правілы і мэту: нехта робіць гэта як хобі, а хтосьці (кшталту, Шведскага аўкцыёну) нават зарабляе на чалавечым азарце досыць вялікія грошы. Зразумела, што мне траціць аніякай капейкі не хацелася, а таму я вырашыў скарыстацца tut.by'еўскім сэрвісам.

Сэнс у тым, што для ўдзелу ў гандлі вам неабходна зарэгістравацца на сайце, а потым пераходзіць па спасылцы на неабходны тавар ды прымаць удзел і, калі пашанцуе, перамагаць. Як толькі інтэрнэт-прастора ўбачыла новага карыстальніка пад дзіўнай мянушкай derkril (назавём яго так), я адразу выставіў неабходныя тавары ў кожнай намінацыі «Камп'ютарных камплектавых». Паводле правілаў гульні, кожны карыстальнік павінен усталёўваць некалькі пазнакаў: пачатковы кошт, мінімальны кошт і бліц-кошт. Такім чынам, сістэма выглядала так: ад пачатковага кошту пачынаюцца стаўкі, дадаецца кожным разам мінімум адна ўмоўная адзінка (яе вы выбіраеце напачатку), прычым атрымаць выйгрыш зможа толькі той, хто перавысіць сваёй стаўкай мінімальны кошт (гэта, нібы, павінна «падагрэць» інтарэс удзельнікаў); але ж, калі нехта адразу паставіць бліц-кошт, дык і перамагае ў тую ж хвіліну. Варта яшчэ заўважыць, што ўсталёўваць звышмерны мінімальны кошт нельга, бо, паводле правілаў, ён можа перавышаць пачатковы толькі на 30 адсоткаў і менш. Такім чынам, я сваім лотам паставіў лічбы 35, 40, 65 адпаведна.

Перамагчы любым коштам!

У кожнага аўкцыёну ёсць свой час дзеяння: ад многіх тыдняў да некалькіх гадзінаў. Зразумела, што чым большы тэрмін вы паставіце, тым больш вам давядзецца чакаць завяршэння, бо, як паказала практыка, зацікаўленыя асобы пачынаюць актыўна рабіць стаўкі толькі ў апошнія гадзіны (калі не сказаць хвіліны) работ аўкцыёну. Не верачы статыстыцы, я на ўласным досведзе ўпэўніўся ў спраўнасці гэтага правіла. Сапраўды, прастаяўшы два тыдні, на мае тавары былі зробленыя толькі дзве стаўкі, што, аднак, нават не дасягалі мінімальнага кошту. З гэтым варта было нешта рабіць. А таму, каб павысіць верагоднасць набыцця майго тавару, давялося звярнуцца па ўласныя магчымасці...

Перавыставіўшы свой лот, вырашыў змяніць крыху стратэгію. Цяпер, падумалася, варта не толькі зменшыць да разумных тэрмінаў працягласць гандлю, але і самому ўдзельнічаць у ім з тым, каб пастаянна трымаць удзельнікаў у напрузе — каб яны адчулі дух спаборніцтва і змагаліся за перамогу, часам нават ахвяруючы пэўнымі грашыма. Гэта вельмі ўдалы псіхалагічны ход: прынамсі, так сцвярджаюць усе арганізатары такога роду мерапрыемстваў... Такім чынам, мой аўкцыён павінен быў цягнуцца не больш за тры дні.

За першыя два дні на тавар паступіла ўсяго адна заяўка, але напрыканцы апошняга дня я вырашыў узяцца за справу. Спярша я зрабіў стаўку ад імя яшчэ аднаго «ліпавага» карыстальніка, якога спецыяльна з гэтай мэтай і стварыў. Хоць я падняў кошт усяго толькі на 1 у.а., але ж гэта істотна паўплывала на працэс гандлю: праз нейкую гадзіну-другую нехта апярэдзіў усе папярэднія стаўкі. Потым недзе праз тры гадзіны на мой тавар з'явіліся яшчэ тры стаўкі, якія, аднак, пакуль не дацягвалі да мінімальнага кошту. Тут я зраб

Падрабязнасці

Адзін аўтамабіль за год спажывае 30 тон паветра...

22 верасня ў краіне пройдзе акцыя «Дзень без аўтамабіля», закліканая звярнуць увагу грамадскасці на экалагічную праблему нашых гарадоў, у прыватнасці, на якасць атмасфернага паветра.

Паводле інфармацыі Мінпрыроды, аўтатранспартны комплекс — буйнейшы забруджвальнік навакольнага асяроддзя. У маштабах краіны доля транспарту ў сумарных выкідах забруджвальных рэчываў у атмасферу ад усіх крыніц дасягае 72 працэнтаў, у выкідах парніковых газаў — каля 10 працэнтаў. За дзень у атмасферу выкідваецца з адпрацаванымі газамі каля 3300 тон забруджвальных рэчываў.

У нашай краіне акцыя «Дзень без аўтамабіля» ўпершыню прайшла летась. Як паведамілі ў Міністэрстве транспарту і камунікацый, падчас яе правядзення плынь аўтамабіляў на асобных вуліцах Мінска зменшылася на 15—20 працэнтаў. Агульны пасажырапаток у цягніках метрапалітэна павялічыўся больш чым на 10 працэнтаў, у аўтобусах, тралейбусах і трамваях — на 8 працэнтаў у параўнанні са звычайнымі днямі. У абласцях краіны было зафіксавана павелічэнне аб'ёмаў перавозкі пасажыраў на 2,5—4 працэнты. У выніку па краіне быў зменшаны выкід забруджвальных рэчываў у аб'ёме звыш 400 тон. Сёлета да арганізацыі акцыі далучацца 17 міністэрстваў краіны, канцэрн «Белнафтахім», абласныя і Мінскі гарадскі выканаўчыя камітэты.

У сярэднім пры прабегу 15 тысяч кіламетраў за год адзін аўтамабіль спальвае 2 тоны паліва і спажывае 30 тон паветра, у тым ліку 4,5 тоны кісларoду. У атмасферу выкідваецца 700 кілаграмаў чаднага газу, 400 кілаграмаў дыяксіду азоту, 230 кілаграмаў вуглевадародаў. Сучасны аўтамабіль вырабляе «кактэйль», што ўключае ў сябе больш чым 200 найменняў забруджвальных рэчываў.

Сяргей РАСОЛЬКА.

БПС-БАНК

ОАО «БПС-Банк» проводит внеочередное Общее собрание акционеров в форме заочного голосования путем письменного опроса 21 сентября 2009 года по адресу: г. Минск, бульвар им. Мулявина, 6, офис центрального аппарата ОАО «БПС-Банк».

ВОПРОСЫ ПОВЕСТКИ ДНЯ:

1. Об оказании ОАО «БПС-Банк» безвозмездной (спонсорской) помощи в 2009 году.

Дата составления списка акционеров, имеющих право на участие во внеочередном Общем собрании акционеров, – 17 сентября 2009 года.

Бюллетени для заочного голосования вручаются акционерам (их представителям), имеющим право на участие во внеочередном Общем собрании акционеров, при их обращении в банк при предъявлении документа, удостоверяющего личность акционера (его представителя).

Акционеры банка могут получить информацию о включении их в список для заочного голосования внеочередного Общего собрания акционеров и другую информацию в соответствии с законодательством Республики Беларусь в местах учета их акций в филиалах и отделениях банка или головном офисе банка по адресу: **г. Минск, бульвар им. Мулявина, 6** или по телефонам: **(017) 289 42 33**, **148** (бесплатно в стационарной сети).

Лицензия НБ РБ на осуществление банковской деятельности № 4 от 13.11.2008 г. УНП 100219673.

ОТКРЫТОЕ АКЦИОНЕРНОЕ ОБЩЕСТВО «КАСКАД-93»,
г. Минск сообщает о проведении внеочередного общего собрания акционеров, которое состоится
29 сентября 2009 года в 14.00
по адресу: г. Минск, ул. Ф. Скорины, 14-226.

Повестка дня:

1. О реорганизации ОАО «Каскад-93» путем присоединения к открытому акционерному обществу «Завод по ремонту и техническому обслуживанию вычислительной техники» (ОАО «Белсчеттехника»), г. Минск, о проведении инвентаризации активов и обязательств ОАО «Каскад-93», подготовке передаточного акта и договора о присоединении.

2. О выкупе ОАО «Каскад-93» собственных акций по требованию акционеров.

3. О преимущественном праве приобретения ОАО «Каскад-93» собственных акций.

4. О заключении договора о предоставлении безвозмездной (спонсорской) помощи.

Списки акционеров для регистрации участников общего собрания составляются на **18 сентября 2009 г.**

Начало регистрации в день проведения и по месту проведения внеочередного собрания акционеров в 13.00.

С проектами решения и другими материалами по повестке дня собрания можно ознакомиться у секретаря Наблюдательного совета по адресу: г. Минск, ул. Ф. Скорины, 14-226 (приемная) за 7 дней до проведения собрания в рабочие дни (понедельник – пятница) с 14.00 до 15.00.

Участникам собрания при себе необходимо иметь документ, удостоверяющий личность (для представителя акционера дополнительно – доверенность).

Телефон для справок: (8 017) 266 39 98.

Наблюдательный совет.

УНП 100016908.

Управляющий КХ «Агросвет» (г. Смолевичи)
проводит 8 октября 2009 г. в 15.00 по адресу:
г. Минск, ул. Академическая, 15/1 открытый аукцион по продаже имущества КХ «Агросвет».

Задаток по лоту – согласно перечню имущества – перечисляется на р/с 3012020543528 в ф-ле № 616 АСБ «Беларусбанк», г. Смолевичи, код 526. Для участия по всему перечню имущества необходимо внести задаток в размере суммы задатка по лоту № 23.

Для участия в аукционе в срок до 01 октября 2009 г. по адресу: г. Минск, а/я 76, управляющему Павловичу А.Г. (тел. 8 029 654 58 48) предоставляются следующие документы:

1. Заявление на участие в аукционе с указанием лота.
2. Платежный документ с отметкой банка о внесении задатка.
3. Копии документов, подтверждающих юридические полномочия участника торгов (его представителя).

Выигравшим торги на аукционе признается лицо, предложившее за лот наиболее высокую цену. Шаг аукциона по каждому лоту равен сумме задатка и указан в перечне выставляемого на торги имущества. Договор купли-продажи имущества заключается в день проведения торгов.

Подробную информацию можно получить, направив соответствующий запрос на электронный адрес: prokhorova_av@mail.ru

Перечень выставляемого на торги имущества:

№ лота	Наименование	Сумма НДС, 18 %	Стоимость с НДС	Сумма задатка, шаг аукциона
1.	Автомат для розлива вина	4 351 744	28 528 098	1 426 410
2.	Емкость	29 640	194 306	9 720
3.	Емкость V-75	909 407	5 961 670	298 080
4.	Емкость V-75	833 623	5 464 864	273 240
5.	Инспекционная машина	1 265 936	8 298 914	414 950
6.	Компрессор	25 718	168 597	8 430
7.	Машина фасовочная для пищевых жидкостей Д9-ВРЕ-6	674 391	4 421 010	221 050
8.	Мерник технический 750 л	169 285	1 109 759	55 490
9.	Машина бутылкомоечная, в том числе электроблок контроля и управления ТН 002297	1 363 824	8 940 622	447 030
10.	Насос для перекачивания вина ВНЦ (разобранный вид)	119 394	782 693	39 140
11.	Принтер “Вилет” 3820	150 942	989 510	49 480
12.	Стальная емкость V-25	667 714	4 377 238	218 860
13.	Транспортер для ящиков 1	713 852	4 679 698	233 990
14.	Транспортер для ящиков 2	763 581	5 005 695	250 290
15.	Транспортер для ящиков 3	687 222	4 505 124	225 260
16.	Транспортер цепной для бутылок	375 427	2 461 133	123 060
17.	Установка для приготовления сиропа	608 325	3 987 908	199 400
18.	Цистерна НЦПУ 9370	272 660	1 787 438	89 370
19.	Электронасос 63/20	98 553	646 068	32 300
20.	Электронасос 125/20	23 476	153 899	7 700
21.	Электроблок учета стеклотары ЭСУ	178 722	1 171 620	58 580
22.	Установка для укупоривания бутылок	534 954	3 506 921	175 350
23.	Помещение магазина «Теремок»	7 960 394	52 184 804	2 609 240

Управляющий А.Г. Павлович

УНН 690021910

Тэму падказаў чытач

ПАРАСЯТЫ ВЫЙДУЦЬ З ЦЕМРЫ?

Пасля з'яўлення артыкула «Чаму пакупніка пазбавілі выбару?» («Звязда», 11 верасня 2009 г.) патэлефанаваў чытач і сказаў прыкладна наступнае: «Вось вы пішаце пра садавіну і гародніну, а ведаеце, што ў нашым горадзе людзі ноччу прадаюць парасят? Пачытайце сённяшнюю раёнку».

Газета «Наш край» падняла праблему рэалізацыі парасят з прыватных гаспадарак — іх у горадзе няма дзе прадаваць. А людзі вязуць на аўтамашынах парсюкоў з Клецкага, Ляхавіцкага, Ганцавіцкага, не кажучы ўжо пра Баранавіцкі раён, і з 2 гадзін ночы да 6 раніцы стараюцца прадаць у закутку на вуліцы Прытыцкага — побач з кааператыўным рынкам. Гандаль не дазволены, але прыходзяць ветурач з касірам. Праводзіцца агляд жывёлы, і касір збірае плату па 1340 рублёў з галавы.

Вось такое становішча склалася з продажам парасят.

Як магло здарыцца так, што вынікі сваёй працы чалавек не можа свабодна, на законнай падставе, рэалізаваць?

За савецкім часам (даводзіцца ўспамінаць) кааператыўны рынак быў калгасным, і тады для вясковага чалавека там было раздолле. Прадавалі розную жывёлу, акрамя коней. Тых жа парасят прывозілі на вазах ці на грузавых машынах здалёку. Прыязджалі зранку, гандаль ішоў да абеду. Таргаваліся, пагаджаліся ці абураліся, але ўсё адкрыта, на відавоку ў людзей. Пазней, бліжэй да нашага часу, тых жа парасят прывозілі на рынак у багажніках легкавушак ці ў прычэпах.

А сялян «бартанулі», калі гаспадаром рынку стаў ПУГП «Каапрынак» і спажыўкааперацыя пачала дзейнічаць у сваіх мэтах — імкнулася атрымаць максімальны прыбытак, што і зразумела.

Ралеты, палаткі, крамы пачалі запаўняць тэрыторыю рынку, а пра тое, што ён прызначаўся для рэалізацыі сельгаспрадукцыі, то ніхто ўжо не ўспамінаў.

Індывідуальныя прадпрымальнікі спраўна плацяць грошы, і гэта задавальняе адміністрацыю рынку і тым больш кіраўніцтва Баранавіцкага райпа.

У гэтай сітуацыі ёсць яшчэ адзін нюанс. Рынак хоць і знаходзіцца на тэрыторыі горада, але падаткі з яго ідуць у раённы бюджэт. А тое, што ноччу з суботы на нядзелю побач з рынкам ідзе гандаль парасятамі, то гэты факт хваляваў найперш жыхароў, якія жылі непадалёку. Шум аўтамашын і парасячае вішчанне сярод ночы не спрыяюць сну.

На думку некаторых кіраўнікоў, за лепшае было б вынесці рынак для продажу жывёлы на ўскраіну горада, але ж у гэтым павінен быць нехта зацікаўлены, ды і трэба ўкласці грошы.

Але калі быць аб'ектыўным, то праблему павінна вырашыць раённая ўлада. Перадача калгаснага рынку спажыўкааперацыі адбылася не без яе ведама. Толькі вось завал узяўся разграбаць гарвыканкам. Я патэлефанаваў і папрасіў **загадчыцу ўпраўлення гандлю горада Валянціну МАХАВІК** пракаментаваць сітуацыю.

— Абурэнне людзей, якія маюць уласныя гаспадаркі, зразумелае і справядлівае. У іх рынак забралі, а ўзамен нічога не далі. Гарвыканкам зрабіў захады для вырашэння праблемы — быў накіраваны ліст «Аб арганізацыі гандлю на рынку» ў Баранавіцкае райпа і райвыканкам, — сказала Валянціна Мікалаеўна.

— Абурэнне людзей, якія маюць уласныя гаспадаркі, зразумелае і справядлівае. У іх рынак забралі, а ўзамен нічога не далі.

Вось вытрымка з гэтага дакумента.

«...меры, якія прымаюцца з боку заснавальніка рынку, маюць тэндэнцыю да прывядзення рыначнага ўтварэння да ўзроўню, які адпавядае сучасным патрабаванням, але разам з гэтым нельга забываць аб першапачатковым прызначэнні рынку па арганізацыі гандлю сельскагаспадарчай прадукцыяй, малаком, жывой жывёлай, птушкай, вырашчанай у фермерскіх гаспадарках, жыхарамі сельскай мясцовасці на асабістых падворках.

Баранавіцкі гарвыканкам неаднаразова звяртаў увагу на недастатковасць гандлёвых месцаў пад арганізацыю продажу вышэйназванай прадукцыі і на падмену функцый гандлёвых прадпрыемстваў па продажы прадуктовых і непрадуктовых тавараў.

У сувязі з вышэй выкладзеным прымаюцца меры па першачарговым выдзяленні дастатковай колькасці рабочых месцаў пад пералічаную прадукцыю...»

Цяжка спадзявацца, што гэты ліст нейкім чынам паўплывае на мясцовую спажывакааперацыю. Вось накіраваць бы на рынак пажарную і санітарную службы, і там, упэўнены, хутка знайшлося б месца для парасят.

Але ж справа больш сур'ёзная, чым здаецца на першы погляд.

Хіба не гучаць на самым высокім узроўні заклікі да развіцця ўласных гаспадарак, да усебаковай іх падтрымкі?!

Гэта з аднаго боку, а з другога — на мясцовым узроўні, не ўлічваючы ўмоў, ідзе ўдушэнне прыватніка. А іншым разам невялікі райцэнтр укараняе ў сябе «сталічныя напрацоўкі». Але магчымае для вялікага горада часта недапушчальнае для малога. Каб уласная гаспадарка развівалася, неабходная свабодная рэалізацыя яе прадукцыі.

Хіба не сумна бачыць, як на падыходзе да рынку стаяць вясковыя жанчыны і прадаюць малако ў поліэтыленавых бутэльках. А ці нармальна тое, што чалавеку забаронена зімой прадаваць вырашчаныя на сваіх сотках садавіну і гародніну? А чаму парасят прадаюць ноччу ў выпадковым месцы, а не на рынку, як павінна быць?

Я думаю, каб гаспадары не былі такія пасіўныя, то і чыноўнікі паводзілі б сябе інакш. Парасяты выйдуць з цемры, але толькі разам са сваімі гаспадарамі.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

У ГАЗЕТНЫМ ПАЛКУ ВЫБЫЛА?

З 1.01.2010 спыняецца выхад штотыднёвіка «Обозреватель».

Да пачатку новага года газета будзе выходзіць у звыклым рэжыме, так што абавязкаў перад падпісчыкамі не парушаць. Сяргей Атрошчанка — уладальнік, заснавальнік і галоўны рэдактар у адной асобе ад адказаў на пытанні ўстрымаўся: «У пятніцу выйдзе газета, там будуць вычарпальныя каментарыі».

Фінансавы крызіс ці нейкія сацыяльна-палітычныя перадумовы адыгралі сваю ролю? Закрыццё гэта ці тайм-аўт? Газетны бізнэс — безнадзейны? І хоць яны ўсё ж застаюцца адкрытымі, адказы прадказальныя...

А калі ісці ад прыватнага да агульнага, то... што з многімі папяровымі газетамі будзе? Іх эканоміка выклікае ўсё больш асцярог?..

Зоя ВАРАНЦОВА.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ТОРГОВ РУП «БЕЛСПЕЦКОНТРАКТ»
проводит 15-й открытый аукцион по продаже объектов республиканской собственности 23 октября 2009 года

Лот	Наименование техники	Местонахождение объекта	Год выпуска	Пробег в км/наработка в м/ч, (износ)	Начальная цена продажи партии, (руб.)	Сумма задатка, (руб.)
1	2	3	4	5	6	7
45.	Аэродромная железобетонная плита ПАГ-14, 4 кат. — 70 шт.	г. Лида, в/часть 19764	1978	80 %	18 200 000	1 820 000
46.	Аэродромная железобетонная плита ПАГ-18, 4 кат. — 92 шт.	г. Лида, в/часть 19764	1977	80 %	25 760 000	2 576 000

Аукцион состоится в 11.00 **23 октября 2009 г.** по адресу: г. Минск, ул. Казинца, 2, 6-й этаж.

Прием документов на участие в аукционе заканчивается в 17.00 **21 октября 2009 г.** по адресу: г. Минск, ул. Казинца, 2, комн. 604.

К участию в аукционе допускаются покупатели, оплатившие задаток. Физические лица обязаны предоставить паспорт и заполнить необходимые документы установленного образца. Юридические лица предоставляют необходимый пакет документов.

Победитель аукциона обязан:

1. Заключить договор купли-продажи 23 октября 2009 года.
2. Произвести оплату стоимости движимого имущества разовым платежом в течение 5-ти банковских дней со дня подписания договора купли-продажи.

Денежные средства перечисляются на расчетный счет РУП «Белспецконтракт»: р/с 3012008660018 в Октябрьском отд. ОАО «БПС-Банк» г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, код 357, УНП 101099370. **Без НДС. Справки по тел.: (017) тел./факс 224 88 05, 224 54 15. Наш адрес в интернете: www.belspeckontrakt.com.**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

Аукцион по продаже недвижимого имущества государственной собственности и на право заключения договора аренды земельного участка для его обслуживания состоится **23 октября 2009 г. в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов.

Организатор аукциона: Минский городской территориальный фонд государственного имущества, г. Минск, пр. Независимости, 8, тел. (8017) 200 20 89, каб 227.

На открытый аукцион выставляется:

№ лота	лот № 1	лот № 2
Предмет открытого аукциона	Здание специализированное физкультурно-оздоровительного и спортивного назначения (инвентарный номер 500/С-30592) и право заключения договора аренды земельного участка для его обслуживания	Здание специализированное для общественного питания (инвентарный номер 500/С-15244) и право заключения договора аренды земельного участка для его обслуживания
Место нахождения недвижимого имущества	г. Минск, пр. Пушкина, 68	г. Минск, пер. Менделеева Д.И. 1-й, д. 50, корп. 2
Начальная цена предмета открытого аукциона, руб.	1 097 801 540 белорусских рублей (в том числе: недвижимое имущество – 388 483 140 белорусских рублей, право заключения договора аренды земельного участка – 709 318 400 белорусских рублей)	837 938 100 белорусских рублей (в том числе: недвижимое имущество – 277 265 500 белорусских рублей, право заключения договора аренды земельного участка – 560 672 600 белорусских рублей)
Размер задатка (рублей), срок и порядок его внесения, реквизиты расчетного счета	109 780 150 белорусских рублей, до подачи заявления на участие в аукционе, путем внесения на р/с 3642900000870 в ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, код 153001795, УНП 100048181 Минского городского территориального фонда государственного имущества	83 793 800 белорусских рублей, до подачи заявления на проведение аукциона, путем внесения на р/с 3642000000015 в ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, код 153001795, УНП 100048181 Минского городского территориального фонда государственного имущества
Продавец недвижимого имущества	Министерство архитектуры и строительства Республики Беларусь, 220 048, г. Минск, ул. Мясникова, 39, тел. (8017) 226 54 29, 226 54 34	Управление образования администрации Партизанского района г. Минска, 220 037, г. Минск, ул. Бумажкова, 37, тел. (8017) 294 63 34, 245 79 80
Информация о земельном участке для обслуживания недвижимого имущества	Общая площадь – 0,1159 га, кадастровый номер земельного участка – 500000000006003509	Общая площадь – 0,2180 га (из них 0,2180 га с ограничениями в использовании – водоохранная зона Слепянской водной системы), кадастровый номер земельного участка – 500000000001004107
Арендодатель земельного участка и срок аренды	Минский городской исполнительный комитет, срок аренды – 80 лет	Минский городской исполнительный комитет, срок аренды – 33 года
Характеристика недвижимого имущества	Общая площадь – 1565,0 кв.м, год постройки – 1989. Отдельностоящее, четырехэтажное здание, стены кирпичные, требуется обследование и проведение капитального ремонта	Общая площадь – 811,5 кв.м., год постройки – 1960. Отдельностоящее, одноэтажное здание в неудовлетворительном техническом состоянии, нет оконных и дверных блоков, стены кирпичные, разрушена система отопления, холодного и горячего водоснабжения. Длительное время не использовалось
Условия использования недвижимого имущества	Для физкультурно-оздоровительного и спортивного назначения	Для дальнейшего использования в соответствии с градостроительными регламентами здания под общественную функцию (общественное питание, объект торговли, культурно-бытовое назначение, административно-хозяйственное назначение)
Условия использования земельного участка	Земельный участок отведен для эксплуатации и обслуживания недвижимого имущества. Беспрепятственный проезд к зданию победителю аукциона обеспечивает ОАО «Опытный завод металлоконструкций»	Земельный участок отведен для эксплуатации и обслуживания недвижимого имущества

Порядок проведения открытого аукциона осуществляется в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже объектов государственной собственности и на право заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества, утвержденным Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26 марта 2008 г. № 462.

К участию в открытом аукционе допускаются: граждане, юридические лица и индивидуальные предприниматели Республики Беларусь, иностранные инвесторы (иностранные государства, объединения, международные организации, иностранные юридические лица, иностранные граждане, граждане Республики Беларусь, имеющие постоянное место жительство за границей, и лица без гражданства), представившие Организатору аукциона в сроки, указанные в извещении на участие в открытом аукционе, следующие документы:

- заявление на участие в аукционе по установленной форме;
- заверенную банком копию платежного поручения о внесении суммы задатка в белорусских рублях на расчетный счет, указанный в извещении;
- юридическим лицом Республики Беларусь или индивидуальным предпринимателем – копию документа, подтверждающую государственную регистрацию юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования;
- иностранным юридическим лицом – копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованные в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык;
- иностранным гражданином или лицом без гражданства – документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованные в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык;
- представителям заявителя (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель) – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке, при необходимости легализованная в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в открытом аукционе заявитель (его представитель) предъявляют документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица также – документ, подтверждающий его полномочия.

Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за 3 дня до даты его проведения. Объект может быть снят с торгов по решению Продавца, Организатора аукциона, аукционной комиссии в любое время до объявления объекта проданным.

Заявления на участие в открытом аукционе с прилагаемыми документами принимаются по адресу: г. Минск, пр. Независимости, 8, каб. 227 – по рабочим дням с 9.00 до 17.00. Последний день приема заявлений – 22 октября 2009 года включительно.

Победителем аукциона признается участник, предложивший наиболее высокую цену. В случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником (далее – претендент на покупку), предмет аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

Минский горисполком в течение 10 рабочих дней после утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона по продаже предмета аукциона принимает решение о предоставлении земельного участка победителю аукциона (претенденту на покупку). Победитель аукциона (претендент на покупку) в течение 10 рабочих дней со дня принятия указанного решения обязан внести плату за право заключения договора аренды земельного участка (в случае предоставления рассрочки ее внесения – часть платы) и возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения, возместить расходы, связанные с формированием земельного участка и изменением земельного участка в результате такого формирования, в том числе с государственной регистрацией в отношении земельного участка. Размер, порядок и сроки возмещения затрат доводятся до сведения участников до начала проведения аукциона. Условия и порядок предоставления рассрочки внесения платы за право заключения договора аренды земельного участка определены решением Минского горисполкома от 5 июня 2008 г. № 1308.

Победитель аукциона (претендент на покупку) в течение одного рабочего дня со дня оплаты должен представить копии платежных документов, названных выше, организатору аукциона, после чего, не позднее 2 рабочих дней, с ним в установленном порядке в соответствии с условиями аукциона продавцом заключается договор купли-продажи недвижимого имущества, а Минским горисполкомом, договор аренды земельного участка.

Осмотр объекта на местности участниками аукциона производится Продавцом:

по лоту № 1 – пр. Пушкина, 68, конт. тел. (8017) 204 20 96, (029) 654 10 88;

по лоту № 2 – пер. Менделеева Д.И. 1-й, д. 50. корп. 2, конт. тел. (8017) 294 63 34, 245 79 80.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	6.48	19.18	12.30
Віцебск —	6.37	19.08	12.31
Магілёў —	6.38	19.08	12.30
Гомель —	6.36	19.04	12.28
Брэст —	7.03	19.33	12.30
Гродна —	7.05	19.33	12.28

Месяц
Маладзік.
Месяц у сузор'і Дзевы.

Імяніны
Пр. *Елізаветы, Раісы, Аўдзея, Апанаса, Глеба.*
К. *Ірмы, Ірэны, Мацея, Станіслава.*

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

НАДВОР'Е на заўтра

Дзве даты

18 верасня

1804 год — 205 гадоў таму адчынілася Свіслацкая гімназія — першая гімназія ў Беларусі. Гаспадар мястэчка граф Тышкевіч даў будынак і сродкі на яго рамонт, а таксама завяшчаў 30 тысяч рублёў срэбрам. Гімназія мела 6 класаў. Выкладаліся мовы, арыфметыка, алгебра, геаметрыя, трыганаметрыя, фізіка, касмаграфія, хімія, мінералогія, гісторыя, міфалогія, прыродазнаўства, батаніка, сельская гаспадарка, садоўніцтва, землеўпарадкаванне, архітэктура, мараль, логіка, рыторыка, паэзія, эстэтыка, маляванне, музыка, гімнастыка. У 1825 годзе ў Свіслацкай гімназіі выкладаў вядомы беларускі паэт Ян Чачот. У 1845-м гімназія была пераведзена ў горад Шаўляй, у Свіслачы засталося павятовае вучылішча, у якім у 1847-1852 гадах вучыўся К. Каліноўскі.

1905 год — нарадзілася Грэта Гарбо, амерыканская актрыса шведскага паходжання. Першае ж яе з'яўленне на амерыканскім экране зрабіла актрысу кумірам публікі. Фенаменальная папулярнасць карцін з яе ўдзелам тлумачылася не толькі тым, што яе ігра ідэальна адпавядала патрабаванням экрана. Вялікае значэнне мела таксама і цікавасць публікі да новага вобраза жанчыны, які стварала Гарбо.

Цытата дня

«Спачатку каханне, затым шлюб: спачатку полымя, затым дым».

Нікаля Шамфор (1741—1794), французскі пісьменнік.

«ЧОРНЫ МЕСЯЦ», або Традыцыйнае стаўленне да «межаў»

У народзе фазу Месяца, калі яго не бачна на небе, таксама называлі «чарнец», «чарнець» або «чорны месяц». Цікава, але калі мы адгорнем сучасныя перакідныя календары, то і сёння ўбачым, што графічная выява гэтай фазы — таксама чорнае кола.

● У народным асяроддзі лічылася, што чалавек ці жывёла, зачатыя ў «межы», не будуць жыць доўга. У такі час ніколі не вадзілі карову на злучку, не саджалі квактуху на яйкі і г.д.

● Нараджэнне «на межах» таксама лічылі адмоўным знакам. Пра такога чалавека гаварылі, што ён ніколі не народзіць дзіця (будзе такім жа «пустым», як месяц у гэты час), рана аўдавее.

● Паўсюдна лічылі, што кураняты, вылупленыя «на межах», ніколі не будуць удалымі.

● Па той самай прычыне «на межах» ніколі не спраўлялі вяселле: засцерагаліся, каб не застацца бяздзетнымі.

● «На межах» ніколі не пачыналі ніякіх спраў, скіраваных на працяг роду, паляпшэнне дабрабыту і г.д. Ніколі нічога не саджалі і не сеялі, лічылі, што тады і каласы будуць «пустымі».

● Выключэннем з'яўлялася пасадка бульбы: адсутнасць Месяца на небе лічылася самым спрыяльным часам для яе пасадкі. Цікава, але нашы продкі параўноўвалі пасадку бульбы з пахаваннем, а для гэтага не выпадкова, а мэтанакіравана выбіралі «межы».

● «Межы», або «касмічную пустату», удала выкарыстоўвалі тады, калі хацелі што-небудзь знішчыць, ліквідаваць, парушыць. Так, «на межах» рабілі пасынкаванне памідораў, падразалі дрэвы і кустарнікі, знішчалі пустазелле.

● Гэты ж час выкарыстоўвалі для выканання магічных дзеянняў, скіраваных на знішчэнне скураных захворванняў: бародавак, мазалёў, лішаёў. Асабліва цудадзейным у такой справе лічылі гарох, украдзены з трох палёў «на межы» і абмалочаны на Каляды. Трэба было ўзяць столькі гарошын, колькі бародавак, правесці імі па скуры і спаліць у печы.

Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.

Усміхнёмся!

Мужык знайшоў на пляжы старадаўнюю цвілую бутэльку, адкаркоўвае — а там джын.

— Выратавальнік, гаспадар! Загадвай тры жаданні, — кажа джын і дастае нататнік. — Толькі не спяшайся, буду запісваць.

— Хачу здароўя!

Джын піша: 1. Медыцынская страхоўка класа «эліт».

— Хачу быць багатым!

Джын піша: 2. Адкрыць рахунак на сто мільёнаў у швейцарскім банку.

— Хачу вялікага, сур'ёзнага, рамантычнага кахання на ўсё жыццё!

Джын піша: 3. Авіякатастрофа ў канцы мядовага месяца.

☺

Аб'ява ў рубрыцы знаёмстваў:

«Мужчына 62/172/80, у апошнім росквіце сіл...»

☺

— Чаму вы сышлі з папярэдняга месца працы?

— Па прычыне стомленасці.

— Якой стомленасці?

— Не ведаю, проста яны сказалі, што вельмі ад мяне стаміліся...

«ХТО САДЖАЕ ДРЭВЫ, ЛЕС — ТОЙ ДУМАЕ ПРА БУДУЧЫНЮ»

Так кажуць у Старадарожскім лясгасе

Такі волат працуе сёння на лесасеках лясгаса. Кіраванне ім даручана маладым аператарам.

Гаючым водарам напоўнены старадарожскія цудоўныя хваёвыя лясы. Гэты водар, іх прыемны смалісты пах, ад якога нават крыху кружыцца галава (відаць, з непрывычкі, бо прывыклі нашы галовы да «роднага» сталічнага чаду), здаецца, піў бы і піў. Бясконца...

— Часцей прыязджайце і піце на здароўе, — запрашае дырэктар Старадарожскага лясгаса Валянцін Цвірко. — Праўда, вось грыбоў, на якія заўсёды багатыя старадарожскія лясы і якіх заадно можна было б назбіраць, пакуль што няма. Але будуць, абавязкова, без іх жа нашы лясы і ўявіць нельга. Штогод збіраем і здаём немалую колькасць іх. Гэта адна з крыніц нашых даходаў па так званай дапаможнай гаспадарцы... Праўда, затое сёлета шмат нарыхтавалі бярозавага соку, каля 300 тон. Вясной амаль кожны дзень па цыстэрне ў Мінск адпраўлялі... Любы лясны рэсурс трэба выкарыстоўваць спаўна, а разам з тым, вядома, і ашчадна. Гэта добра ўмеюць рабіць нашы людзі...

Дырэктар Старадарожскага лясгаса Валянцін ЦВІРКО.

На плошчы, большай за 70 тысяч гектараў, раскінуліся лясы Старадарожскага лясгаса, звыш 80 працэнтаў іх, як зразумела ўжо, — хваёвыя. Умела і беражліва даглядаюць іх работнікі лясгаса, пра што, у прыватнасці, сведчаць многія ўзнагароды калектыву (так, сёлета лясгас па выніках сваёй дзейнасці за першае паўгоддзе заваяваў першае месца па міністэрстве і першае месца па Мінскім абласным лесагаспадарчым аб'яднанні, пра што, у прыватнасці, красамоўна сведчыў пераходны чырвоны сцяг, які знаходзіўся ў кабінеце дырэктара; лясгасу як адной з лепшых лясных гаспадарак падараваны трактар МТЗ-82 на рэспубліканскіх дажынках пазалеташняга года). Але, напэўна, найбольш яскрава сведчаць пра ўвесь адпаведны клопат старадарожскіх леснікоў зробленыя іх рукамі прыгожыя альтанкі і акуратна абсталяваныя месцы адпачынку ўздоўж дарог, што праходзяць праз лясы Старадарожчыны.

* * *

Адну з такіх альтанак, праўда, не з тых, што месяцца ўздоўж дарог, а тую, якая знаходзіцца на тэрыторыі сярэдняй школы ў пасёлку Горкі, і зафіксаваў фотакарэспандэнт газеты. Аднак прычым тут школа? Менавіта ў ёй створана моцнае школьнае лясніцтва. Адпаведна, школьнікі гэтага незвычайнага лясніцтва займаюцца амаль усімі ляснымі справамі, актуальнымі для работнікаў лесу: садзяць лес, даглядаюць яго, ачышчаюць ад смецця, якое, паводле выразу ляснічага Горкаўскага лясніцтва Івана Буя, пакідаюць пасля сябе ў лесе тыя, хто «неакуратна адпачывае» (ніжэй мы яшчэ спынімся на гэтым і паспрабуем знайсці больш моцныя словы ў адрас «неакуратных») і г.д. Школьнікі з гэтага незвычайнага лясніцтва нават маюць у лясным гадавальніку лясгаса (гадавальнік знаходзіцца на тэрыторыі ўсё таго ж Горкаўскага лясніцтва) свой участак на 15 сотак для сваіх лясных вопытаў. А яшчэ з дапамогай работнікаў лясніцтва школьнікі праклалі ў ім сваю экалагічную дарожку. Што ўяўляе сабой гэта дарожка? На ёй, як расказаў ляснічы, размешчана восем так званых станцый, кожная з якіх чым-небудзь адметная: там знаходзяцца або маладыя пасадкі, або агароджаныя мурашнікі, або прыгожы бярозавы гай... Вядома, юныя леснікі не проста прагульваюцца па гэтай экалагічнай дарожцы, а выходзяць на яе (а выходзяць яны рэгулярна), але і выказваюць адпаведны клопат пра стан гэтых аб'ектаў. Канчатковая мэта ўсяго гэтага — экалагічнае выхаванне падлеткаў, прывіццё любові да прыроды, да родных мясцінаў, да роднага краю. А дарэчы, як нам такой любові яшчэ нестае! Ва ўсякім разе, многім з нас.

Рабочы цэха цыліндроўкі Аляксандр МІХАЛЬКЕВІЧ зазначае: «Якасцю апрацоўкі драўніны заказчык будзе задаволены».

— Экіпіроўка старадарожскіх лесарубаў адпавядае сусветнаму стандарту, — гаворыць лесаруб Юрый АМЯЛЬЧУК.

— Нешта прапусцілі мы ў экалагічным выхаванні людзей, — зазначае дырэктар Старадарожскага лясгаса Валянцін Цвірко. — Вы паглядзіце, што пакідаюць пасля сябе тыя, хто, так бы мовіць, адпачывае, — бутэлькі — як пластыкавыя, так і шкляныя, розныя пакеты. У лесе нават можна знайсці выкінуты стары халадзільнік. Зноў жа: тую ж альтанку леснікі толькі што паставілі, а назаўтра яе ўжо паламалі... Ды нашы леснікі проста плачуць ад усяго гэтага. Але нічога не зробіш, усё, што ўбачаць пасля гэтых набегаў радарожскага лясгаса. Але нас, шчыра кажучы, больш за ўсё зацікавіў чырвоны фундук, які, паводле слоў сімпатычнай начальніцы гадавальніка Наталлі Кучмій, быў завезены аднекуль з Амерыкі. А калі дакладней сказаць, зацікавілі плады гэтага дрэва, якія на працягу свайго выспявання мяняюць афарбоўку, і як можна было зразумець, смачныя. «Позна», — расчаравала нас Наталля Кучмій. Як высветлілася, актыўна цікавяцца імі і многія іншыя, і гэтыя іншыя ўжо адпаведным чынам выказалі гэту цікаўнасць. Карацей кажучы, няма ўжо тых пладоў.

Зрэшты, усё гэта датычыцца, так бы мовіць, больш лёгкіх амараў прадукцыі гадавальніка. А вось больш грунтоўныя стаяць у чарзе па саджанцы таго ж чырвонага фундука. І не толькі па фундук, але і па многія іншыя саджанцы... Гадавальнік цалкам забяспечвае сваімі саджанцамі хвоі патрэбы лясгаса, а таксама прадае іх іншым лясгасам; дэкаратыўныя культуры набываюць камунальная служба горада, насельніцтва. У гадавальніку працуюць 7 чалавек. Летам, зразумела, найбольш гарачы час — тут даглядаюць лясныя пасевы, збіраюць ураджай з шыпшыны, чарнаплоднай рабіны, якія таксама растуць у гадавальніку. Гадавальнік носіць званне ўстановы «высокай культуры». За што прысвоілі гэта званне? За добры выхад пасадачнага матэрыялу, за наладжванне ідэальных умоў для яго вырошчвання. Гадавальнік пры гэтым акупляе сваю дзейнасць, што ў Старадарожскім лясгасе лічаць найгалоўнай умовай любога віду дзейнасці. Дарэчы, у лясгасе вырошчваюць не толькі саджанцы дрэў і кустоў, але і кветкі.

* * *

Якая можа быць лясная работа без нарыхтовак лесу? Вырашчаны лес — гэта ж для лесаводаў тое самае, што ўраджай для хлебаробаў...

Падчас наведвання намі Старадарожскага лясгаса нам паказалі гэтыя самыя лесанарыхтоўкі. Увогуле, самі лесанарыхтоўкі даводзілася бачыць і раней, але тое, што паказалі нам цяпер, мы ўбачылі першы раз. А цяпер уявім: вось стаіць высокая, пад 40 метраў, хвоя таўшчынёй каля 50 сантыметраў — праходзіць усяго каля мінуты — і яна ўжо поўнасцю пазбаўленая галля, парэзаная на асобныя бярвёны, ляжыць на зямлі... І выконвае ўсю гэту работу ўсяго адзін чалавек, адзін лесаруб. Фантастыка! Праўда, сядзіць гэты самы вельмі спрытны лесаруб за рычагамі магутнага і вёрткага так званага харвестара, ці дакладней — націскае на рычажкі яго джойсціка. Толькі сёлета вясной набылі яго ў лясгасе, а ўжо добра ацанілі яго работу. Літаральна за лета «асвоіў» ён вялізную лясную дзялянку, прыбраць якую ад драўніны ў работнікаў лясгаса цяпер яўна не хапае сілаў. Хоць, між іншым, на харвестары, як сказана ўжо, працуе ўсяго адзін чалавек (адзін падчас змены, а ўсяго на ім задзейнічаныя чатыры чалавекі, якія змяняюць адзін аднаго; сам жа агрэгат працуе поўнасцю на працягу сутак). Харвестар нарыхтоўвае за суткі каля 300 кубаметраў драўніны, для чаго лесарубаў спатрэбілася б (няхай і з найлепшымі шведскімі піламі) каля 30 чалавек. Адсюль, вядома, і няўвязка з той жа ўборкай драўніны. Праўда, у лясгасе ўдакладняюць: гэта часовая няўвязка, бо вось-вось у яго павінен паступіць фарвардар — самы надзейны «партнёр» таго ж харвестара, які гэтак жа хутка складзіруе і адгружае нарыхтаваную драўніну. Прычым, калі харвестар — фінскай вытворчасці, то фарвардар набылі ўжо ў айчыннага «Амкадора». Новая тэхніка, падкрэсліваюць у лясгасе, хоць і нямала каштуе, але ўжо даволі хутка павінна сябе акупіць. «Гэта вельмі добрае і выгаднае ўкладанне сродкаў», — падкрэсліваюць тут.

У Старадарожскім лясгасе не так даўно прайшло чарговае лесаўпарадкаванне, падчас якога, як звычайна, вызначаецца стан лясных насаджэнняў — спеласць лесу, яго ўзрост, запасы драўніны і г.д. Згодна з вынікамі гэтага лесаўпарадкавання да лясгаса давялі штогадовае заданне высечкі лесу: на сёлета гэта заданне склала каля 140 тысяч кубаметраў (менавіта столькі драўніны трэба нарыхтаваць). У параўнанні з мінулым годам аб'ём павялічыўся амаль у 3 разы. «Якраз сёлета нам асабліва патрэбная наша цяперашняя магутная лесанарыхтоўчая тэхніка», — падкрэсліваюць у лясгасе.

Аднак высечкі — высечкамі, а найпершы клопат лясных работнікаў — вырошчваць лес, няўхільна сачыць за тым, каб не станавіліся бяднейшымі нашы лясныя рэсурсы, а наадварот — папаўняліся новымі насаджэннямі. Клапоцяцца аб гэтым і ў Старадарожскім лясгасе — па 350 гектараў і больш садзяць новага лесу штогод, давялі лясістасць свайго раёна да 52 працэнтаў. «Хто саджае дрэвы, лес, той думае пра будучыню», — так гаворыць дырэктар лясгаса.

Асаблівы клопат — ахове лесу ад пажараў, тым больш, што іх вельмі баяцца хвойнікі, якія ў лясгасе, як ужо сказана, уладараць. У Старадарожскім лясгасе не скупяцца не толькі на сучасную лесанарыхтоўчую тэхніку, але і на сучасныя сродкі аховы лесу. У прыватнасці, у ім устаноўленыя тры вышкі (у трох лясніцтвах) тэленазірання за становішчам у лесе, якія дазваляюць вельмі хутка заўважыць на гарызонце дымок і вылічыць яго дакладныя каардынаты. «Будзем ставіць такое тэленазіранне ў кожным лясніцтве, — зазначае дырэктар лясгаса (дарэчы, а ўсіх лясніцтваў у лясгасе сем), — выдаткі на іх поўнасцю апраўдваюць сябе».

* * *

Па 100 тысяч долараў штомесячна зарабляюць у Старадарожскім лясгасе на экспартных пастаўках прадукцыі. Што пастаўляюць? У асноўным перапрацаваную танкамерную драўніну, а ў прыватнасці так званую палетную дошку, вінаградныя калы, а таксама бярозавыя балансы (зноў-такі: танкамерныя). Увогуле, у агульным аб'ёме лесанарыхтовак каля 50 працэнтаў драўніны работнікі лясгаса перапрацоўваюць непасрэдна ў сябе, і ў асноўным менавіта танкамер (больш гатунковая драўніна адпраўляецца на айчынныя дрэваапрацоўчыя камбінаты). Лясгас мае два цэхі. У адным з іх выпускаюцца ацыліндраваныя бярвенцы (ідуць пераважна для абуладкавання лазняў), у другім — тая ж дошка палетная, а таксама дошка для падлогі, вагонка (як хваёвая, так і альховая) і іншыя вырабы. Абсталяванне ў цэхах — сучаснае, высокапрадукцыйнае. На адным з участкаў нам паказалі, як на гэтым абсталяванні апрацоўваюць нават тыя гарбылі, з якіх, здавалася, ужо няма чаго і ўзяць — толькі ў печку. Тым не менш — бяруць.

— Усё ў нашай справе, ды і не толькі ў нашай — у любой, павінна прыносіць даход, — неаднойчы праводзіў гэту думку дырэктар лясгаса. — Інакш навошта тады і працаваць. Трэба ўважліва лічыць кожны патрачаны рубель, сёння трэба ўмець менавіта зарабляць.

Увогуле, наконт перапрацоўкі лесу непасрэдна ў лясгасах яшчэ не так даўно ішлі даволі гарачыя спрэчкі: маўляў, а ці павінны работнікі лясной гаспадаркі займацца перапрацоўкамі лесу, іх найпершая справа — садзіць лес, даглядаць яго. Гэта — аснова ўсяго... Жыццё, аднак, усё расставіла па сваіх месцах. У Старадарожскім лясгасе і не адмаўляюць той жа «асновы»: вырошчванню лесу — уся ўвага. Вядома, пры гэтым немалаважная ўвага надаецца і лесанарыхтоўкам (вырошчванне лесу і лесанарыхтоўкі — гэта, па сутнасці, двухадзіны працэс). А вось падчас лесанарыхтовак нярэдка з'яўляецца пытанне: куды падзець дробнатаварную драўніну; на яе, як правіла, ахвотнікаў не знаходзіцца. Ужо расказвалася, якім чынам вырашаюць гэта пытанне ў Старадарожскім лясгасе. Застаецца зазначыць: у цэлым ад сваёй лесагаспадарчай дзейнасці, хоць часам і не вельмі прыбытковай (так, сёлета работнікі Старадарожскага лясгаса напружана папрацавалі на разборцы лесапавалаў у Чэрвеньскім лясгасе; хоць і не вельмі там зарабілі, але выручыць калегаў — гэта ў Мінскім аб'яднанні святая справа), маюць у лясгасе рэнтабельнасць, якая складае 20 працэнтаў. Вельмі няблага, асабліва калі ўлічваць, што сёлета і сусветныя цэны пайшлі ўніз. «Было ў мінулым годзе 120 еўра за кубаметр, а сёлета ўжо толькі 80. Але і 80 трэба браць, калі ўжо не даюць больш», — кажуць у лясгасе.

* * *

Не толькі лесам адзіным жывуць у Старадарожскім лясгасе. Трэба паглядзець, які аздараўленчы цэнтр увялі сёлета на цэнтральнай сядзібе гаспадаркі: лазня, більярд і г.д. А басейн, як адзначыў ваш фотакарэспандэнт — аўтарытэтны знаўца ўсялякіх водных працэдур, — такі і ў Мінску цяжка знайсці. І што яго больш за ўсё ўразіла: водапыласос, хоць, шчыра кажучы, аўтар тэксту артыкула неяк і не звярнуў на гэта асаблівай ўвагі. Затое ён звярнуў увагу на розныя драўляныя аздабленні ў аздараўленчым цэнтры — усё гэта зроблена рукамі старадарожскіх майстроў-леснікоў. А яшчэ вельмі пашкадаваў, што на час наведвання лясгаса ў яго аздараўленчым цэнтры быў жаночы дзень.

Яшчэ адзін вельмі прываблівы аб'ект ужо хутка будзе ўзведзены ў Старадарожскім лясгасе, прычым гэты аб'ект змогуць наведваць усе ахвотныя без выключэння, у адрозненне ад таго ж аздараўленчага цэнтра, прызначанага толькі для работнікаў лясгаса. Гэты аб'ект — двухпавярховы домік паляўнічага. Наверсе ў ім будзе шэсць асобных нумароў, унізе — вялікая зала, кухня, саўна, і зноў-такі — маленькі басейн. А побач — возера, якое лясгас узяў у арэнду ды прывёў яго ў належны парадак, добра зарыбіў. Словам, адпачывай да поўткі, на двое і болей. А больш за ўсё адрозніцца ён на наведванне Старадарожчыны замежнымі гасцямі — паляўнічымі, тым больш, што і рознай дзічыны ў старадарожскіх лясах нямала водзіцца (і ў гэтым таксама сказваецца адпаведны клопат работнікаў лясгаса: тут няблага яе падкормліваюць, засяваюць у лесе спецыяльныя дзялянкі). Словам, будзе дзе разгарнуцца замежнаму госцю — адпачыць з належным камфортам ды падыхаць на поўныя грудзі «азонам» цудоўных старадарожскіх лясоў. Ну, а лясгасу — даход. Між іншым, у лясгасе ўжо ёсць домік паляўнічага, але ён стаў ужо крыху цеснаваты, тым не менш, і яго вырашана захаваць — няхай таксама прыносіць даход. Варта дадаць: паляўнічая гаспадарка лясгаса, як і ўсе іншыя віды дзейнасці ў ім, — самаакупная.

* * *

Не так даўно падчас выкананння земляных работ знайшлі ў старадарожскіх лясах (каля вёскі Старыя Фалічы) камень. Нават не камень, а сапраўдны асколак гары, які, як мяркуюць тут, важыць больш за 100 тон. Гэты камень у раёне тут жа занеслі ў лік сямі цудаў свету Старадарожчыны, а лясгас, так бы мовіць, узяў яго на свой баланс: зрабіў да яго пад'езд, устанавіў побач альтанку... Любяць работнікі лясгаса сваю Старадарожчыну, робяць усё, каб падабалася яна і іншым, каб добра ведалі пра яе.

* * *

P.S. Напярэдадні прафесійнага свята многія работнікі лясгаса за сваю добрасумленную працу адзначаны ў адпаведных загадах. Пры гэтым начальнік цэха дрэваапрацоўкі Дзмітрый Белавы ўзнагароджаны Ганаровай граматай Міністэрства лясной гаспадаркі, станочнік цэха Аляксандр Карпаў атрымаў падзяку міністра; а вадзіцель лесавоза Юрый Целеш і ляснічы Залужскага лясніцтва Ігар Кульчыцкі адзначаныя Ганаровай граматай Мінскага вытворчага лесагаспадарчага аб'яднання, інжынер па знешнеэканамічнай дзейнасці Мікалай Кохан — Граматай аб'яднання. Дырэктару лясгаса Валянціну Цвірко прысвоена званне «Ганаровы лесавод».

Віншуем!

Іван БАРАНОЎСКІ.
Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

УНП 600208889.

УХІЛ — НА РАЦЫЯНАЛЬНАЕ ВЫКАРЫСТАННЕ ЛЯСНЫХ РЭСУРСАЎ

Асобныя вынікі работы Мінскага вытворчага лесагаспадарчага аб'яднання

Па выніках працы за паўгоддзе першае месца сярод аналагічных арганізацый Міністэрства лясной гаспадаркі заняў калектыў Мінскага вытворчага лесагаспадарчага аб'яднання. Пры гэтым тры лясгасы аб'яднання — Старадарожскі, Капыльскі і Слуцкі — таксама прызнаны лепшымі ў міністэрстве, адпаведна — яны занялі першае, другое і трэцяе месцы.

Як паведамілі ў планава-эканамічным аддзеле аб'яднання, выручка ад рэалізацыі прадукцыі ў ім за 8 месяцаў склала 77 мільярдаў рублёў, або 106 працэнтаў да плана; рэнтабельнасць — 9,5 працэнта пры плане 7 працэнтаў. У аб'яднанні атрымалі 6,7 мільярда рублёў прыбытку ад рэалізацыі прадукцыі. За 7 месяцаў на 6,6 мільёна долараў ЗША яе экспартавалі.

У лясгасах аб'яднання паступаюць новая лесанарыхтоўчая тэхніка, дрэваапрацоўчае абсталяванне, вядзецца будаўніцтва паляўнічых комплексаў, абнаўляюцца будынкі лясніцтваў. Якраз напярэдадні прафесійнага свята расчыніў свае дзверы новы паляўнічы комплекс у Лагойскім лясгасе. Інвестыцыі ў асноўны капітал за 8 месяцаў склалі каля 15 мільярдаў рублёў.

У лясгасах аб'яднання на плошчы 5,6 тысячы га пасаджаны лясныя культуры, на плошчы 5,9 тысячы га выкананы высечкі па доглядзе ў маладняках.

Нямала дадатковых клопатаў у лесаводаў аб'яднання выклікаюць стыхійныя праявы прыроды, так званыя бураломы. У мінулым годзе стыхія нямала нарабіла бяды ў лясах Бярэзінскага лясгаса, у гэтым годзе яна прайшлася па лясах Чэрвеньскага і зноў-такі Бярэзінскага лясгасаў, а таксама некаторых іншых. На дапамогу тым, хто пацярпеў ад стыхіі, у аб'яднанні прыходзяць усе, ліквідуюць яе наступствы, як тут падкрэсліваюць, усёй грамадой.

